Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 240 (5073)
КАСТРЫЧНІКА
26
ПЯТНІЦА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

У КАЛГАСАХ БССР АБ'ЯДНАНА 61,2 проц. БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК

Сканчэнне сельска-гаспадарчага года ў БССР адзначаецца масавым уступленнем у калгасы працоўных аднаасобнікаў. За трэці квартал у калгасы ўступіла 46.831 гаспадарка. Арганізавана 428 новых калгасаў. Найбольш перадавымі па калектывізацыі з'яўляюцца: Мсціслаўскі раён — 87,4 проц., Чэрыкаўскі — 86,5 проц., Менскі — 84,1 проц., Уздзенскі — 85,5 проц., Сенненскі — 76,8 проц., Лёзненскі — 75,3 проц. і інш.

Найбольш адстаючымі па калектывізацыі з'яўляюцца: Стара-Дарожскі раён — 34,1 проц., Лельчыцкі — 39,5 проц., Уваравіцкі — 40 проц. і Веткаўскі — 41 проц.

На 1 кастрычніка ў калгасах БССР аб'яднана 61,2 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. З 1 студзеня процант калектывізацыі па Беларусі павялічыўся на 10,2 проц.

У КОЖНЫМ РАЁНЕ ЗАКОНЧЫЦЬ ХЛЕБАЗАКУПКІ ДА ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРА

Дзевяць раёнаў у рэспубліцы закончылі хлебазакупкі. Яны здолелі разгарнуць кампанію так, што за максімальна кароткі тэрмін правялі шырокую растлумачальную работу сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, даказалі ім усю выгоднасць і дзяржаўнае значэнне продажу хлеба.

І як рэзультат, за якіх-небудзь тры дэкады хлебазакупкі былі праведзены з поспехам. Але гэта толькі дзевяць раёнаў. Астатнія 66 усё яшчэ не могуць завяршыць кампанію. Прычым 10 раёнаў: Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Дубровенскі, Камарынскі, Мсціслаўскі, Плешчаніцкі, Старадарожскі, Чырвонапольскі, Клічаўскі і Чэрвеньскі пусцілі справу на самацёк і топчуцца на месцы па хлебазакупках.

Замест дзелавой большэвіцкай работы кіраўнікі гэтых раёнаў займаюцца балбатнёй, заклінаннямі, прызнаюць памылкі, але ад гэтага, як кажуць, не лягчай. Лішкі хлеба прадаўжаюць аставацца ў калгасах, у аднаасобнікаў. Возьмем, напрыклад, Брагінскі і Старадарожскі раёны (сакратары т.т. Кожар, Шалапёнак). Тут прама трэба сказаць, кіраўнікі іх займаюцца балбатнёй, гастралёрствам, але не хлебазакупкамі.

Гэтыя райкомы не разумеюць таго, што хлебазакупкі ёсць важнейшая дзяржаўная кампанія, што гэта кроўная справа кожнага комуніста і сумленнага беспартыйнага працаўніка. Людзі не разумеюць, што ад правільнай пастаноўкі работы па закупках хлеба мы няўхільна будзем павышаць загартаванасць калгаснікаў, будзем выхоўваць у іх разуменне агульнадзяржаўных задач і інтарэсаў.

Трэба растлумачыць калгаснику і працоўнаму аднаасобніку ўсю выгоднасць і дзяржаўнае значэнне хлебазакупак і тады, безумоўна, хлеб пойдзе.

А што мы бачым на справе ў тых-жа Брагінскім, Старадарожскім, Чэрвеньскім і іншых раёнах?

У Чэрвені, напрыклад, кіраўнікі раёна адседжваюцца ў цэнтры. На сходах арцелей сампромкааперацыі, на сходах супрацоўнікаў раённых устаноў яны распінаюцца ва ўсю аб хлебазакупках, грамяць «стаўку на самацёк», але ні адзін з іх не пасядзеў пэўны час у калгасе, сельсавеце, не дапамог нізавым работнікам арганізаваць хлебазакупкі. Гэтыя вяльможы лічаць, што іх справа аб'ехаць на машыне ў адзін дзень добры дзесятак сельсоветаў і на гэтым іх місія заканчваецца. Такія-ж прыёмы работы ў Старадарожскім і Брагінскім раёнах. Гэтыя факты зусім не адзіныя. Яны характэрны і для многіх другіх раёнаў. З другога боку, замест дзелавой дапамогі і кіраўніцтва ёсць рад абураючых выпадкаў дэёргання, вокрыкаў, масавых рэпрэсій з боку раённых арганізацый у адносінах да нізавых работнікаў.

Сакратары райкомаў, старшыні райвыканкомаў, інструктары, каператыўныя работнікі, выязджаючы на месцы на доўгія тэрміны, павінны самі паказаць нізавым работнікам, як трэба працаваць.

Наступная сума пытанняў—гэта вывазка закупленага хлеба. Ва многіх раёнах закуплены хлеб ляжыць на складах, яго не вывозяць. Добрая дарога не скарыстоўваецца. І ў рэзультаце з наступленнем дрэннай пагоды закуплены хлеб надоўга можа астацца ў глыбінных пунктах. Трэба неадкладна вывезці на склады Заготзярна ўвесь закуплены хлеб. Для гэтага трэба мабілізаваць увесь транспарт. Трэба абвясціць рашучую і бязлітасную барацьбу своеасаблівому «очковтирательству», калі па заключаных дагаворах з калгасамі на продаж хлеба ўключаюць гэту колькасць у зводкі. Так было ва Ўваравіцкім раёне, такія факты ёсць у Расонскім і інш. раёнах. Гэту дутую сістэму закупак трэба выкрыць і выкараніць. Закупленым лічыцца толькі той хлеб, які паступіў на склады.

Спрэчкі на мясцах паміж Заготзярном і канторамі райспажыўсаюза ў радзе выпадкаў перарасліі ў простую ангыцэзяржаўную справу. Людзі даходзяць да таго, як гэта мела месца ў Полацкім раёне, што работнікі Заготзярна двойчы аплачваюць закуплены каапераціяй хлеб толькі для таго, каб уключыць яго ў сваю зводку. Ёсць нямала выпадкаў адмаўлення работнікаў Заготзярна ад прыёмкі хлеба, закупленага каапераціяй. І наадварот, ёсць выпадкі, калі кааперацыя (Крычаўскі раён) адмаўляецца выдаваць тавары за праданы калгаснікамі Заготзярну хлеб.

Трэба каб райкомы, райвыканкомы, пракуратура рашуча прыцягвалі да адказнасці канкрэтных винаватых. І, нарэшце, аб **атаварванні праданага хлеба.** У «Звяздзе» ўжо прыводзіліся прыклады злачынных адносін да прасоўвання тавараў з боку асобных цэнтральных і нізавых арганізацый. Агіднасці прадаўжаюць рабіцца і ў даны момант. Чоткія, зусім ясныя ўказанні ЦК і СНК аб адгрузцы ў вёску раду вострадэфіцытных тавараў (шкло, цвікі, металічныя вырабы) яшчэ не выкананы.

На мясцах ёсць рад фактаў (Чэрыкаў, Жлобін), калі тавары залежваюцца на базах або мясцовымі работнікамі разбазарваюцца.

Усё гэта наносіць аграмадную шкоду справе хлебазакупак. Трэба вінаватых караць самым бязлітасным чынам. Усе тавары, выдзеленыя на закупку хлеба, прызначаныя толькі для калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, якія прадаюць хлеб, і ніякіх адступленняў, нават самых нязначных не павінна быць.

Кіраўнікі адстаючых раёнаў павінны зразумець, што папярэджанняў для іх было больш чым даволі. І калі яны не зробяць крутога павароту, партыя вымушана будзе ў адносінах да іх прыняць самыя рашучыя меры. Асабліва трэба падцягнуць аднаасобны сектар, які па БССР рэзка адстае. Туды павінны быць кінуты галоўныя сілы з раёнаў і сельсоветаў.

Да Окцябрскай гадавіны мы маем усе магчымасці завяршыць хлебазакупкі. І трэба, каб кожны райком, райвыканком, кожны сельсавет бушаваў так сваю работу, каб дастойна сустрэць Окцябрскую гадавіну большэвіцкімі справамі—стопроцантным выкананнем задання па хлебазакупках.

ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ ПАТРАБУЮЦЬ НЕ ЗАКЛІНАННЯЎ, А КАНКРЭТНАГА, АПЕРАТЫЎНАГА КІРАЎНІЦТВА

Каб павысіць зацікаўленасць калгаснікаў у апрацоўцы ільну трэба арганізаваць рэгулярную выдачу хлебнага аванса калгаснікам, занятым на апрацоўцы ільну, трэба цвёрда праесці ў жыццё закон урада аб налічэнні двух працадзён за выкананне дзённай нормы па апрацоўцы ільну. Адначасова РК, РВК і палітаддзелы павінны забяспечыць прымяненне агратэхнічных мерапрыемстваў, забяспечваючых высокую якасць валакна—сартыроўку трасты перад пасадкай у еўні, адлежку ільну пасля сушкі і мяцця, сартыроўку трапанага валакна і т. д.

СПРАВА ПУШЧАНА НА САМАЦЁК

(Ад гомельскага карэспандэнта «Звязды»)

Калгасы і аднаасобнікі Гомельскага раёна на сёнешні дзень здалі: калгасы 2,8 проц., а аднаасобнікі толькі 0,2 проц. Трэба прыняць пад увагу і тое, што і гэтыя мізэрныя процанты загатовак ільну атрымалі толькі за апошнюю пяцідзённку, пасля абвешчанага так званага «штурму». А да гэтага часу раён ішоў па ільнозагатоўках з дзесятымі долямі процантаў.

Ёсць адна, самая асноўная прычына гэтага. Ніхто з раённых арганізацый ні каплі ўвагі не аддаў ільну. Не толькі зараз, пры апрацоўцы і здачы, але і пры сяўбе і ўборцы. Толькі зараз даведаліся ў гарза і Заготільне, што два калгасы Жгунабудскага сельсавета ні соткі ільну не пасеялі, замест пат рэбных пасеяць па плану па 2 гектары. Зараз таксама выяўляюцца дзесяткі аднаасобных гаспадарак, не выканаўшых сваіх абавязацельстваў па пасеву ільну.

Але не гэта прычына такіх ганебных лічбаў па ільнозагатоўках. У раёне пад лён было засеяна і ўбрана 500 гектараў. Ні гарза, ні МТС, нават палітаддзел, не заняліся пытаннем апрацоўкі і здачы ільновалакна. Лічылі, што такое нязначнае заданне пойдзе самацёкам. А якраз самацёкам лён не пашоў. У калгасах не спалучылі ўсіх іншых работ з ільнопрацоўкай і здачай, а чакінулі яго напаследак.

У калгасе «Інтэрнацыянал» (старшыня тав. Пінчук, член партыі) два тыдні лён ляжаў у ёўнях і не прыступалі да пераапрацоўкі, спасылаючыся выключна на тое, што зараз жанчыны заняты на другой рабоце.

Калгас «Пролетарый», Прыліпкаўскага сельсавета, меў 27 гектараў пад ільном і да гэтага часу яшчэ не прыступіў да яго апрацоўкі. Ужо 8 тыдняў як лён ляжыць на сцеліішчах, яго не ўзнімаюць і не сушаць. Гэты калгас пад носам раённых арганізацый, пад носам палітаддзела МТС.

Ніхто не паклапаціўся аб хутчэйшай апрацоўцы ільну. На базе Белсельснаба для Гомельскага раёна каля двух месяцаў стаіць ільнотрапальная машына Гарлачова і яе не забіраюць. Зараз яшчэ ідуць спрэчкі ў МТС, у гарза аб выкупе і перадачы гэтай машыны якому-небудзь калгасу.

У адных калгасах стаяць ільнамялкі і не скарыстоўваюцца, а ў другіх адчуваецца вялікая ў іх патрэба.

У апошні час гарадскі камітэт партыі мабілізаваў групу таварышоў з партыйнага актыва для ўзмацнення тэмпаў ільнопрацоўкі і здачы. Трэба прызнаць, што эфект пакуль зусім нязначны. Па 22 кастрычніка на базу Заготільна паступіла ільну толькі ад 8-мі калгасаў з 61 па раёну. З астатніх яшчэ ніводнага грама не паступіла.

Значна горш стаіць справа па аднаасобнаму сектару, які здаў толькі 0,2 проц. Не ліквідован аграмаднейшы разрыў паміж падняццем ільну і яго апрацоўкай (узнята 88 проц.).

Гомельскі раён мае ўсе магчымасці зняць сябе з чорнай дошкі. Для гэтага трэба менш рэзалюцый і абяцанняў выносіць, а пабольш дзелавой, канкрэтнай работы.

ПАЛЯШЧУК.

НЕДААЦЭНКА ВАЖНЕЙШАГА МЕРАПРЫЕМСТВА

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»)

У калгасе **«Чырвоны земляроб»,** Красналуцкага сельсавета (Лепельшчына) апрацоўка ільну праходзіць дзесяты дзень. За гэты час 23 жанчыны апрацавалі толькі... 1 цэнтнер валакна.

У чым прычына такой ніжкай выпрацоўкі?

Старшыня калгаса Клюня імкнецца растлумачыць гэта тым, што нерацыянальны нормы выпрацоўкі, нельга выстрапаць 8 кілограмаў у дзень. Правяраем, як хто выпрацоўвае. Аказваецца, што лепшыя ўдарніцы Ульяна Пяруч, Марыля Радзюк, Наста Прыстаўка і Казлоўская штодзённа выстрапляюць звыш 8 кг. Але справа ў тым, што ў калгасе за выкананне норм выпрацоўкі не налічваюцца 2 працадні. Гэтым-жа ўдарніцам, як і лодырам, якія выстрапваюць па 1½-2 фунты, залічваюць адзін працадзень.

Такое становішча ў большасці калгасаў раёна. У калгасе «Пражэктар», «Заможнік», «Чырвоная зорка» і іншых за выкананне нормы ставяць крыжык. Аб двух працадніх ні ў адным калгасе не ведаюць. Ва многіх калгасах практыкуюць запісванне за выкананне нормы лепшым трапальшчыцам 1,25 працадня. У калгасе «Перамога» запісваюць адзін працадзень ільнячы, а поўпрацадня «асульныя».

Больш таго. У значнай частцы калгасаў ільняныя працадні зусім не налічваюцца. У калгасе імя Молатава, Капчынскага сельсавета, за 20 дзён работы на ільне трапальшчыцам не запісана ніводнага працадня.

Зусім не запісваюць працадзён у калгасе імя Леніна. Тут калі трэба было размяркоўваць хлеб за лён, то пачалі падлічэнне ільняных працадзён з веснавых работ. Гэта праверка ішла наступным чынам. Старшыня калгаса Валасюк выклікаў да сябе калгаснікаў і пытаўся:

— Ты працаваў па ільне?

— Працаваў.

— А чаму ў цябе гэтага не відаць у працоўнай кніжцы?

— Не ведаю, мабыць не запісана.

Тады Валасюк зварачаецца да адказнай па ільну:

— Запішы яму 10 працадзён.

Такія факты маюць месца і ў калгасе «Барацьбіт» (Сушанскі сельсавет).

У раёне яўна ігнаруецца дырэктыва аб правільным налічэнні ільняных працадзён. РК КП(б)Б і РВК не далі патрэбных указанняў, што за выкананне нормы запісваюцца два працадні. Недаацэнка гэтага важнейшага мерапрыемства прывядзе да аслаблення тэмпаў апрацоўкі ільну на калгасах раёна.

ЛОСЬ.

ЗАКЛІНАННІ ЗАМЕСТ КАНКРЭТНАГА КІРАЎНІЦТВА

ЧЭРЫКАЎ. **(Ад карэспандэнта «Звязды»).**

Аб недапушчальным затягванні загатовак ільнопрадукцыі ў Чэрыкаўскім раёне РК КП(б)Б і РВК прынялі незлічоную колькасць пастаноў. У кожнай з іх мы знаходзім шмат суровых і «звычайных» вымоў, папярэджанняў, шмат «моцных» фармулёвак і ні аднаго канкрэтнага мерапрыемства па практычнай арганізацыі пераапрацоўкі валакна ў калгасах і аднаасобным сектары раёна.

Парадаксальнасцю вынясення пастаноў такі: скончылася пяцідзённка — зводка паранейшаму напоўнена трывожнымі лічбамі — ёсць пастанова. І так у канцы кожнай пяцідзённкі РК і РВК канстатуюць: «Прызнаць, што апошняя пяцідзённка не дала належнага пералому ў ходзе ільнозагатовак...».

Між тым, становішча загатовак ільнопрадукцыі ў раёне саюзны пагражаючае. На 20 кастрычніка ў раёне выкананна 33,2 проц. плана, прычым аднаасобны сектар, які павінен здаць каля 20 проц. ільнопрадукцыі ўсяго раённага плана, да здачы ільну амаль не прыступіў.

Ёсць такія сельсоветы (Кіменскі, Шароеўскі, Зябенскі, Хаўмянскі і інш.), якія на працягу верасня і паловы кастрычніка «загатовілі» ад 80 да 300 кілограмаў валакна — менш аднаго процанта сваіх планаў.

У чым справа? Чаму Чэрыкаўскі раён, які на працягу ўсёй вясны і лета знаходзіўся ў ліку перадавых раёнаў рэспублікі, цяпер адстае?

Галоўная прычына гэтага ў тым, што пасля першых поспехаў, у раёне наступіў перыяд шкоднага самасупакаення. Кіраўнікі раёна не зразумелі, што своечасовае правядзенне ільнозагатовак патрабуе штодзённай напружанай работы.

Ні ў адным калгасе раёна не выконваецца пастанова ЦК КП(б)Б аб пераключэнні на апрацоўку ільнопрадукцыі не менш 50 проц. рабочай сілы: апрацоўкай ільну ў калгасах займаюцца адзінкі асоб.

Калгас «Чырвоны сцяг» (Лабанаўскі сельсавет) павінен здаць дзяржаве 62 цэнтнеры валакна. Тут былі ўсе магчымасці даўно здаць гэту колькасць ільнопрадукцыі дзяржаве. Аднак, да сёнешняга дня план ільнозагатовак калгас выканаў на 10 проц. Прычыны такога становішча ў прамым сабатажы старшынёй калгаса Уласенкам дырэктыў партыі аб пераключэнні 50 проц. рабочай сілы на апрацоўку ільну. У гэтым калгасе больш 159 жанчын, а на апрацоўку ільну вызначаецца 10-15. Калгас мае трактарную 6-вальную ільнамялку. Аднак, яна не скарыстоўваецца, таму што праўленне калгаса ніяк не «зобяра» патрэбную колькасць людзей да машыны.

За чатыры дні на трактарнай ільномялцы апрацавалі 140 кіло ільну, у той час як пры поўнай нагрузцы машыны можна было адпрацаваць да 10 цэнтнераў валакна.

У суседнім калгасе «Перамога» больш паловы ільну ляжыць на сцеліішчы, частка яго пачала. Тут апрацоўку падпятага ільну даручылі нявопытным людзям, якія толькі псуюць яго. Здаючы калгасам 80 кіло ільну ледзь прыняты чацвертым нумарам.

Чаму калгаснікі памянёных калгасаў не запісаны працаваць па ільне? Аказваецца, у гэтых калгасах не ведаюць, што атрыманы за зданы лён хлеб павінен размяркоўвацца выключна паміж калгаснікамі, працуючымі на ільне.

Тут нельга прайсці міма прамой бяздзейнасці райсаюза, які з'яўляецца адзіным загатоўшчыкам ільнопрадукцыі ў раёне. Райсаюз, атрымаўшы звыш 10 тон хлеба і значную колькасць промтавараў для выдачы калгасам за лён, трымае гэта ў строгім сакрэце.

ФОНКАЦ.

ПАПРАЎКА

У карэспандэнцкім запісе выступлення т. Гікало (гл. апошні сказ 5 абзаца, знізу апошняй калонкі) карэспандэнт даў няправільную фармуліроўку.

Гэты сказ трэба чытаць так: «Мы не можам дапусціць апартуністычнага самацёку. Неабходна арганізаваць справу, мабілізаваць людзей».

МАГІЛЕЎСКІ ШАЎКОВЫ ГІГАНТ

У ажыццяўленне рашэнняў з'ездаў ВКП(б) і КП(б)Б, паставіўшых, як цэнтральную задачу, індустрыялізацыю нашай краіны, X УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД СОВЕТАЎ паставіў даручыць «ураду Беларускай ССР і ў далейшым неаслабна праводзіць індустрыялізацыю Беларускай ССР, усё больш павялічваючы вядучую ролю прамысловасці» (з пастаноў X з'езда советаў БССР).

Гэта рашэнне ператворана ў практычную справу. З часу з'езда ў Беларусі, пры брацкай дапамозе ўсяго СССР, пабудованы дзесяткі новых прадпрыемстваў, маючых не толькі рэспубліканскае, але і ўсесаюзнае значэнне.

Сёння мы паказваем адно з магутных прадпрыемстваў—дзеішча першай пяцігодкі—Магілеўскую шэўковую фабрыку. Гэта прадпрыемства мае не толькі ўсесаюзнае, але па сваёй магутнасці, свайму абсталяванню становіцца ў рад лепшых еўрапейскіх прадпрыемстваў.

Фабрыка абсталявана па апошняму слову тэхнікі. Пабудова такога гіганта карэнным чынам змяніла твар не толькі магілеўскай прамысловасці, але і самога горада Магілева.

Пяцітысячны калектыў фабрыкі з'явіўся асноўнай сілай, асноўнай базай апоры ў рабоце партыйных і совецкіх арганізацый. Самае выдатнае ў жыцці і рабоце пяцітысячнага калектыва—гэта тое, што, асвоіўшы ўвесь тэхнапагічны працэс работы, калектыў пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі зараз з месяца ў месяц, з квартала ў квартал перавыконвае промфінплан. Гэта можна тлумачыць толькі тым, што на фабрыцы па-большэвіцку змагаюцца за аўладанне тэхнікай, за выкананне шасці гістарычных умоў таварыша Сталіна.

Фабрыка з'явілася школай перавыхавання прышоўшых на яе рабочых. Яркім прыкладам могуць служыць вырасшыя кадры з былых сялян, саматужнікаў, служачых і т. д., прышоўшых на фабрыку, якія не толькі асвоілі вытворчасць, але вылучаны, як лепшыя знаўцы, кіраўнікамі цэхаў, брыгад і т. д. Рабочы клас, авалодваючы тэхнікай, стварае сваю вытворча-тэхнічную інтэлігенцыю.

Чытаючы паласу, прысвечаную шаўковай фабрыцы імя тав. Куйбышэва, чытач там знойдзе і вынаходцаў, і рабочых інжынераў, тэхнікаў і герояў-ударнікаў, з гонарам выконваючых промфінплан. БССР ганарыцца такім гігантам—дзеішчам першай пяцігодкі. Гэтым гонарам ахоплен кожны рабочы, кожны працоўны.

Толькі ленінска-сталінская нацыянальная палітыка магла забяспечыць тое, што БССР стала краінай індустрыяльна-аграрнай.

І шаўковая фабрыка ёсць адзін з наглядных доказаў той аграмаднай напружанай работы нашай партыі па падцягванню да ўзроўню перадавых былых народаў калоній і поўколоній, якія прыгняталіся царскім самаўладствам, па ліквідацыі эканамічнай і культурнай адсталасці нацыянальных рэспублік, якая дасталася нам у спадчыну ад царызма.

Дасягнутыя калектывам поспехі ёсць РЭЗУЛЬТАТ КІРАЎНІЦТВА ЦК КП(б)Б НА ЧАЛЕ З Т. ГІКАЛО, ёсць рэзультат таго, што партыйны камітэт змагаецца за ажыццяўленне рашэнняў партыі.

Задача заключаецца ў тым, каб не супакойвацца на дасягнутых поспехах, а сканцэнтраваць усе сілы на ліквідацыі недахопаў з тым, каб уступіць у гадавіну Окцябра і прыйсці да з'ездаў советаў з новымі і новымі поспехамі.

РАЗГУЛ БЕЛАГА ТЭРОРУ У ІСПАНІІ

РАБОЧЫЯ КАТАЛОНІІ ПАТРАБУЮЦЬ СКАСАВАННЯ ПРЫГАВАРОЎ ВАЕННЫХ ТРЫБУНАЛАЎ

ПАРЫЖ, 24 кастрычніка. (БЕЛТА). З Іспаніі паведамляюць аб страшэнным разгуле белага тэрору і аб шматлікіх забойствах революцыйных рабочых. Надзвычайныя трыбуналы засядаюць удзень і ўноч. Нарастае абурэнне сярод каталонскіх рабочых, якія пагражаюць усеагульнай стачкай у выпадку, калі гэтыя прыгавары не будуць скасаваны.

Фашысткі і ўрадавы друк распускае недарэчнейшыя правакацыйныя чуткі, падрыхтоўваючы глебу для новых масавых рэпрэсій. Пушчаны дзікія чуткі, што паўстанцы нібыта выкалалі вочы дзецям жандараў, захопленых у палон. Нават урадавае паведамленне вымушана было **абвергнуць** гэтыя гнусныя чуткі.

* * *

ПАРЫЖ, 23 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, у Астурыі налічваецца больш **2500 забітых.** Ваенныя суды штодзень выносяць новыя смяротныя прыгавары.

Пліцыя арыштавала старшыню тафармісцкага профсаюзнага аб'яднання Іспаніі «Усеагульны рабочы саюз» **дэ-Грасіа,** а таксама сына **Ларго Кавальеро,** лідэра іспанскай социялістычнай партыі.

АНГЛІЙСКАЯ ГАЗЕТА АБ ГЕРАІЧНАЙ БАРАЦЬБЕ РАБОЧЫХ АСТУРЫІ

ЛОНДАН, 24 кастрычніка (БЕЛТА). **«Таймс»** публікуе найшырэйшае праз цэнзуру пісьмо свайго мадрыдскага карэспандэнта, якое, не гледзячы на яўна варожыя адносіны кансерватыўнай газеты да іспанскага пролетарыята, рысуе яркую карціну гераічнай барацьбы рабочых у Астурыі. «На працягу 2-х тыдняў, — піша карэспандэнт, — горны раён Астурыі, які налічвае 2 тыс. капальняў і мноства металургічных прадпрыемстваў, на якіх занята каля 40 тысяч рабочых, поўнасцю знаходзіўся ў руках рабочых».

«Прыдаўленыя цяжкай работай і натхнёныя палкай верай у комунізм, рабочыя, — піша карэспандэнт, — задоўга да паўстання рыхтаваліся да гэтага дня вызвалення. Калі гэты дзень наступіў, яны пашлі на ўсе ахвяры, якія патрэбваліся ад іх».

ЯПОНА-АМЕРЫКАНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

ЛОНДАН, 24 кастрычніка. (БЕЛТА). Японска-амерыканскія морскія перагаворы цягнуліся паўтары гадзіны. Як паведамляе Рэйтэр, японцы раз'яснілі сваю пазіцыю «у вельмі шырокай форме». Услед за тым амерыканцы паставілі рад пытанняў, дабіваючыся растлумачэння.

Пазіцыя японцаў, паводле слоў Дэвіса, не аказалася не чаканай для амерыканцаў, якія цалкам прадбачылі японскія прапановы, блізка адпавядаўшыя таму, што ўжо было агалошана.

Рэйтэр указвае, што амерыканская дэлегацыя некалькі абескураджана неуступчывасцю Японіі і размерам японскіх патрабаванняў. Амерыканцы па ранейшаму рашуча супроць змянення існуючых морскіх пастаноў. Згодна вестак агенцтва, японцы намекнулі на свой намер разарваць вашынгтонскі дагавор.

АНГЛІЯ ЗАНЕПАКОЕНА СТАНОВІШЧАМ У ЕЎРОПЕ

ПАРЫЖ, 24 кастрычніка. (БЕЛТА). **«Эвр»** указвае, што нават у Англіі зараз куды больш занепакоены становішчам у Еўропе, чым пытаннем аб морскіх узбраеннях. Выявіўшыйся дэфіцыт германскага бюджэта паказвае, паводле слоў газеты, што становішча Германіі к пачатку зімы будзе выключна цяжкім.

З другога боку, на англічан зрабіла ўражанне паведамленне аб выпаходстве ў Германіі бяспумных самалётаў. Англічане,—піша «Эвр»,—як відаць, яшчэ ў большай ступені, чым французы, схільны думаць, што Германія можа рашыцца ў бліжэйшыя месяцы на які-небудзь безрассудны акт.

У Еўропе чадзяць бомбы

Рыс. Н. Лёфына.



РАССТАНОЎКА СІЛ...

ЦК ЛЕЙБАРЫСЦКАЙ ПАРТЫІ АДМОВІЎСЯ АД ПЕРАГАВОРАЎ АБ АДЗІНЫМ ФРОНЦЕ

ЛОНДАН, 24 кастрычніка. (БЕЛТА). Рэйтэр паведамляе: «У адпаведнасці з ранейшым рашэннем, зацверджаным на з'ездзе лейбарыстскай партыі ў Саўтпорце, ЦК лейбарыстскай партыі на сваім сёняшнім пасяджэнні ў Лондане адмовіўся ўступіць у якія небудзь перагаворы з компартыяй аб стварэнні адзінага фронта».

У ЗАСЦЕНКАХ ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

ПАКУТЫ ЭРЫХА МЮЗАМА У КАНЦЛАГЕРЫ У БРАНДЭНБУРГУ І ЗАБОЙСТВА ЯГО*)

Артыкул т. ВЕРНЕРА ГІРША, б. галоўнага рэдактара „Ротэ фанэ" ў Берліне, НАПІСАНЫ СПЕЦЫЯЛЬНА ДЛЯ „ЗВЯЗДЫ"

У канцлагерах германскага фашызма Дахаў, Зоненбургу, Ораніенбургу і інш. пад дуламі кулямётаў, за калючым дротам пакутуюць звыш 170.000 рэвалюцыйных рабочых, дзеячоў мастацтва і навукі. НА ЗДЫМКУ: фашысцкая жандармерыя дапытвае зняволенага ў двары лагера Дахаў.

У верасні 1933 г., праз паўгода пасля майго зняволення, мяне са зборным транспартам перавезлі з турмы Плетцэнзее ў **канцлагер у Брандэнбургу.** З усіх турмаў гітлераўскай Германіі гэты лагер, бадай, быў самы жудасны. У канцлагеры Дахаў было яшчэ больш забойстваў. У той час як дахаўцы адносіліся з уласцівай ім баварскай прымітыўнай жорсткасцю, у Брандэнбургу лютавала банда азвярэлых, разбэшчана-садысцкіх катаў. Там быў адзін флігель з камерамі, які зняволеныя называлі **«домам смерці».** Там, напрыклад, быў зной дзен голы збяшчэшчаны труп зняволенай там брандэнбургскай партыйнай работніцы тав. **Гертруды Пітэр.**

Самыя цяжкія пакуты ў Брандэнбургу выпалі на долю Эрыха Мюзама. Цяжка сабе ўявіць, якім катаванням падвяргалі яго фашысцкія каты. Часамі Мюзам знаходзіўся ў такім стане, калі ў яго замест вушэй па абодвух баках галавы былі **пухліны, крывападцёкі і нагнаенні, велічынёй ледзь не** ў чайную чашку. Да чаго зачастую тупавумна дзейнічалі фашысцкія каты пры іх «рамясле» паказвае наступны выпадак. 9 лістапада 1933 г. яны ярасна штурмавалі асобныя камеры, у якіх знаходзіліся палонныя і задавалі ім такія пытанні: «Які сёння дзень?».

— Гадавіна гітлераўскага паўстання.

— І хто яго падавіў?

— Пан фон-Кар і генерал рэйхсвера, фон-Лосаў.

На гэта ашалеўшыя СС (ахраннікі):

— Не, гэта жыд Мюзам са сваёй совецкай рэспублікай.

Як вядома, баварская совецкая рэспубліка існавала ў 1919 годзе. З красавіка 1919 па 1925 г. Эрых Мюзам, які быў у складзе баварскага ўрада, знаходзіўся безупынна ў зняволенні. І ў 1923 годзе, у часе гітлераўскага путчу, ён быў у турме. Але, па думцы нічога не падазраваючых СС, «Мюзам са сваёй совецкай рэспублікай» падавілі гітлераўскі путч.

Яго разам з яшчэ адным маладым яўрэйскім зняволеным закавалі па руках і гналі па двару лагера, збіваючы нагайкамі. Мюзам, не паспяваючы за імі, зваліўся. Таварыша яго збівалі да таго часу пакуль ён не пабег далей, цягнучы за сабой Мюзама. Пазней, калі Мюзама ўжо аднаго гналі па двару, збіваючы яго, ён прабаваў схавацца ў лазарэце. Але там прыняўшыя яго санітары—таксама СС, спусцілі яго галавой уніз з каменнай лесніцы, зноў у кіпцюры яго катаў. У медыцынскай дапамозе яму было адмоўлена. Усе практыкаваліся ў пошуках новых метадаў катаванняў Мюзама. Выкручвалі суставы пальцаў назад. У ноч пад новы год ахуталі яго ў мядзвежую скуру і з вяроўкай на шыі валаклі яго па вуліцах Брандэнбурга і розных тракцірах, прычым нацыянал-сацыялісцкая зграя здзек валася над ім і катавала яго.

У сярэдзіне студзеня Мюзама з Брандэнбурга перавялі ў канцлагер у Ораніенбаум. І там яму прыходзілася нямала цярпець ад СА, хоць і не ў такой кашмарнай форме, як у Брандэнбургу ў СС.

Што асабліва кідалася ў вочы ў ораніенбургскім лагеры ў 1934 годзе—было бессаромнае крывадушша ў адносінах заграніцы. Як толькі чакалася загранічная камісія прадстаўнікоў друку, камендант лагера прымаў здаведныя меры. Так званыя каменныя мяшкі, у якіх запіраліся палонныя і якія былі настолькі малымі, што зняволены мог толькі стаяць, або скурчыўшыся прысесці на жорстачы, ослабаняліся ад зняволеных і папаўняліся бульбай. Аружэйныя майстэрні, у якіх выраблялася або рамантавалася зброя, кулямёты, палявыя тэлефоны — гэта было галоўным даходным прадпрыемствам лагера — ператвараліся раптам у майстэрні, у якіх зняволеныя выробляюць для сябе розныя «сувеніры» ў выглядзе скрынак, шахматаў і т. д. Характэрным з'яўляецца выпадак з Мюзамам, мёўшы месца ў сувязі з наведваннем канцлагера прадстаўніком друку. У той час, калі ён, як яўрэй, са зняволеных у лагеры больш за ўсіх падпадаў здзекам і непасрэдным катаванням, яго раптам выклікалі к каменданту Шэферу. Ён вельмі далікатна з ім гутарыў, прапанаваў расказаць яму гісторыю сваіх пакут і крывадушна сімуляваў «шчырае спачуванне». Шэфер паказаў Мюзаму ўжо напісанае распараджэнне каменданту ры ўсім адзяленням лагера, паводле якога ў будучым забараняліся ўсякія катаванні, а галоўнае — тэрарызаванне Мюзама. Камендант даў яму слова, што волас не ўпадзе з яго галавы, калі ён на наступны дзень ад замежных карэспандэнтаў утоіць тыя здзекі, якія адбываліся да гэтага часу. Мюзам даў сваю згоду, часткова маючы на ўвазе аблягчыць гэтым агульнае становішча зняволеных у лагеры.

Карэспандэнт — калі не памыляюся — супрацоўнік «Дейлі мэйль» — прыйшоў і быў, згодна праграмы, уведзен у заблутжэнне. Праз два дні Мюзам у першы раз зноў быў збіт і каменныя мяшкі зноў напоўніліся людзьмі. Хлусня, якой хацелі адурачыць прадстаўнікоў друку, прымала часамі смешны характар. Ім хлусілі, што зняволеныя і СС атрымліваюць аднолькавыя харчы, у той час як ў сапраўднасці для адных і другіх ежа была зусім розная.

Неўзабаве пасля 30 чэрвеня лагер у Ораніенбургу быў ліквідаваны і яго жыхары перавезены ў Ліхтэнбург. У адзін з апошніх дзён па перасуду Мюзам быў забіт. Выбралі гэты час у надзеі, што ў агульным вэрхале масавых забойстваў пасля 30 чэрвеня гэта забойства пройдзе незаўважаным. Несумненна, забойства Эрыха Мюзама адбылося з ведама вышэйшых улад.

9 ліпеня апаўдня Эрыха Мюзама павялі ў адміністратыўны корпус. Там начальнік СС штурмавікоў Эрат сказаў яму дасло ўна: «Мюзам, я раю вам павесіцца ў трохдзённы тэрмін. Калі вы да таго часу гэтага самі не зробіце — зробім гэта мы».

Гэтыя словы былі пацверджаны праходзіўшым у гэты час таварышам, якому давялося іх пачуць. Мюзам расказаў аб гэтым здарэнні таварышам і даў ім слова ні ў якім выпадку не зрабіцца сваім катам.

Пасля гэтага кіраўнік банды эсэсаўцаў (ахраннікаў) Вернер спытаў зняволеных, аб чым з імі гаварыў Мюзам, і ўвёў яго. Ён не спускаў яго з вачэй, прымусіў яго чысціць вопратку эсэсаўцаў і трымаў яго доўга пад пяглядам. У той час як зняволеныя былі ўжо адасланы на пакой, Мюзама прымусілі прадаўжаць работу.

Зняволеныя, якія звычайна рабілі ўборку памяшкання, і таму адпраўляліся спаць на гадзіну пазней, на гэты раз былі зараз-жа адпраўлены ў спальныя памяшканні. Потым было забаронена зняволеным ноччу праз двор праходзіць у клазет.

Наступнай раніцай зняволеныя знайшлі труп Мюзама ў клазеце вісеўшым у пятлі. Вяроўка была так складана прыладжана, што бездапаможны Мюзам ні ў якім выпадку не мог сам яе прымяніць. Знадворны выгляд мерцвяка не насіў ніякіх адзнак удушэння. Выраз яго твару быў уціхамірны. Вочы не былі выпучлены, як гэта звычайна бывае ў павешаных. Адно вока было закрыта, другое напалову адкрыта, быццам міргаючы. На целе не было ні новых слядоў катаванняў, ні агнястрэльных, ні колатых ран. Ноччу не чутно было таксама ніякага шуму. Па стану трупа можна было зрабіць толькі адно заключэнне: Мюзам у адміністратыўным корпусе быў спачатку аглушан, а потым інекцыей яду атручан. Труп праз двор вынеслі ў клазет і там павесілі.

Мюзам комуністам не быў і ў палітычных адносінах на працягу ўсяго свайго жыцця не пайшоў бы далей свайго анархічнага пункту погляду. Але ў канцэнтрацыйным пекле ён ясна недвузначна праяўляў пункт погляду поўнай салідарнасці і агульнасці з намі, комуністамі, у кожным выпадку ўзгадняўся з намі, цікавіўся нашымі поглядамі на падзеі, на розныя з'явы ў жыцці лагера ў адносінах адзельных асоб і т. д.

Яго чалавечы гераізм, які не пакідаў яго не гледзячы на страшныя катаванні, заўсёды спалучаўся з найлепшымі, чэснымі і непасрэднымі таварыскімі адносінамі.

*) Вядомы нямецкі рэвалюцыйны паэт, які іграў відную ролю ў Баварскай совецкай рэспубліцы.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ У КАЛГАСЕ „ВЫЗВАЛЕННЕ"

(Пісьмо калгаснікаў)

У калгасе **«Вызваленне»**, Рагінскага сельсовета, **Буда-Кашалёўскага** раёна, панує паўпейшая безгаспадарчасць. Для пабудовы скотнага двара разабрана 17 хлявоў і тры гумны. Але большасць гэтага матэрыялу пашла на дровы калгаснікам.

Коні даглядаюцца надзвычай дрэнна, поюцца адзін раз у суткі. Выпраж за коньмі не замацавана і як вынік — усе коні змулены.

Старшыня калгаса **Лапачкоў** за гаспадарцы не клапоціцца. Старшыня і праўленне сістэматычна займаюцца самаснабжэннем, разбазарваюць калгасную муку, цукар і іншыя прадукты.

ШАЎЧЭНКА В., ХОМЧАЖКА В., ХОМЧАНКА Х.

***

Буда-Кашалёўская. (Ад спецыяльнага карэспадэнта «Звязды»).

Факты, прыведзеныя ў пісьме калгаснікаў, пры праверцы на месцы **пацвердзіліся.** Праўленне і старшыня калгаса Лапачкоў аб гаспадарцы зусім не дбаюць. Брыгадзір другой брыгады **Шалабудаў** паводзіцку адносіцца да гаспадаркі, за што яго ўжо некалькі раз судзілі.

На двары валяюцца сельска-гаспадарчыя машыны і ржавеюць ад дажджу. Калгасныя будынкі разбіраюць на дровы, у той час як ліцаральна за адзін кілометр ад калгаса прадаюцца дровы.

Сёрта года з'едзена коньмі. На гародзе ляжыць больш тоны бульбы, якая таксама распягваецца кім папала.

У другой брыгадзе на двары кінулі кучу абмалочанай вікі, якая гніе.

У адным сенавале працякае страха, і сена ўжо напалову згніло.

Аб усіх гэтых злачынствах і безгаспадарчасці ведае начальнік райза тав. **Канапацкі,** але мер ніякіх не прымае.

Райком партыі абмежаваўся толькі тым, што прымацаваў да гэтага калгаса свайго інструктара **Хартончыка,** які за ўвесь 1934 год быў у гэтым калгасе толькі раз.

ЛУЦЗВІЧ.

НАЧАЛЬНІКУ ОРС'а ГАЛОЎДАРТРАНСА тав. ТУРКЕНІЧУ.

САМАСНАБ'ЖЭНЦЫ У КІРАЎНІЦТВЕ ВІЦЕБСКАГА ОРС'а

(Пісьмо рабочага)

У ОРС участка 701 (Віцебск) пралезла цэлая група шкоднікаў і самаснабжэнцаў, якія лепшыя тавары і прадукты разбазарваюць. На працягу некалькіх месяцаў рабочыя па іх віне не атрымліваюць пайка. Даволі часта бываюць перабоі ў выдачы хлеба па тры і больш дзён.

Прыгарадная гаспадарка з-за такога «кіраўніцтва» мае вялікі дэфіцыт, больш чым на 2 тысячы руб.

У верасні ОРС для цэнтралізаванага снабжэння атрымаў тры тоны бульбы, з якіх 1 то на згніла на складзе. Адказны выканаўца Машарскі даў загад скарыстаць гнілую бульбу для харчавання ў сталоўцы.

ОРС засмечан класава-варожымі элементамі: Машарскі — сын буйнага лесапрамыслоўца, Наймарк — дачка гандляра.

Не адстае ад гэтай кампаніі і сам начальнік ОРС Старыковіч. Ён скарыстоўвае аўтамашыну на раз'езды па Гарадоцкаму і Сураўскаму раёнах для перавозкі прадуктаў загатоўленых для асабістых патрэб і сваёй кампаніі.

28 верасня Старыковіч закупіў яблык у калгасе па 50 кап. кілограм. Ён тут-жа іх рассартаваў—лепшыя забраў сабе і сваёй кампаніі па сабекошту, астатнія прадаў рабочым па 1 руб. за кіло. З атрыманых поўтары тоны цукерак палову падзялілі паміж сабой.

ФЕДАРАЎ.

СТАРШЫНІ ВІЦЕБСКАГА ГОРСОВЕТА тав. АЗЕРЫНУ

НА ПРАВАХ ПАСЫНКАЎ

(Пісьмо студэнта)

Дырэктар рабфака Віцебскага парткома тав. Шэрбан, калі праводзіў набор, то ўсяго набіпаў: «Будуць студэнты забяспечаны як стыпендыяй, так і інтэрнатам».

Але не тое на справе.

Студэнтам, пражываючым у горадзе, інтэрнатаў не даюць. Яны са сваёй 45-рублёвай стыпендыі вымушаны плаціць 15 руб. за кватэру. Да студэнцкай сталоўкі іх таксама не прымацавалі.

Такое становішча прывяло да таго, што сярод студэнтаў з'явіліся настроі пакінуць вучобу.

ЧЫГУНОЎ.

САКРАТАРУ ПАРТКОМА МЕНСКАЙ СОЎПАРТШКОЛЫ тав. ГУРЗВІЧУ

ВАДА ВЫВОЗІЦЬ

(Пісьмо студэнтаў)

У менскай соўпартшколе пытаннем паляпшэння бытавых умоў не займаюцца.

У сталовай брудна, вокны пабіты. Сістэматычна не хапае абедаў. Повар, каб знайсці выхад, падлівае ў капёл ваду.

Хлеба замест 200 грамаў к абеду даюць 150 грам.

Студэнты ў інтэрнатах паспельную білізну мяняюць толькі раз у месяц. Медагляду студэнты не праходзяць.

Шанай, Кароль, Канач і іншыя.

Па слядах пісем

„ПРАКУРОР І РАЙМІЛІЦЫЯ ПАТУРАЮЦЬ ЗЛАДЗЕЯМ"

Пад такім загалоўкам 14 чэрвеня гэтага года ў «Звязде» было змешчана пісьмо групы селькораў-калгаснікаў, у якім яны пісалі аб пакражы ў калгасе «Чырвоная Беразоўка», Мазырскага раёна, 3 коней і 1 каровы.

Мазырскі РК КП(б)Б паведамляе, што справа разгледжана выязной сесіяй мазырскага нарсуда. Злодзеі **Жолуб і Качура** прыгавораны **на 10 год пазбаўлення волі кожны.**

А. АЎГУСТАЙЦІС ✦ ✦ ✦ **САКРАТАР ЦК ЛКСМВ**

ІНІЦЫЯТЫВУ І ЭНЕРГІЮ ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА— НА ПЕРАВЫБАРЫ СОВЕТАЎ

Комсамол з'яўляецца школай рознастайнай дзяржаўнай і палітычнай дзейнасці. Комсамол, якім кіруе ленінская партыя, яднае пад сваімі сцягамі тысячы маладых рабочых і калгаснікаў нашай краіны. У БССР амаль 50 проц. усяго рабочага класа складае моладзь. Яе ў часе перавыбараў советаў павінен арганізаваць, згуртаваць ленінскі комсамол на барацьбу за выкананне дырэктыў партыі, за пабудову бясклаcавага сацыялістычнага грамадства.

Дзесяткі і сотні лепшых юнакоў і дзяўчат з радоў ленінскага комсамола і моладзі праявілі і зарэкамендавалі сябе, як добрыя і дастойныя работнікі советаў. Рабочыя і калгаснікі ахвотна галасуюць за лепшых комсамольцаў і лепшых прадстаўнікоў нашай моладзі; выбіраючы іх у советы, давяраючы ім гэту адказнейшую работу.

Удзельная вага комсамольцаў і моладзі ў советах БССР значная.

Старшынямі сельсоветаў працуюць 74 комсамольцы; намеснікамі старшынь—99, сакратарамі сельсоветаў — 216, членамі сельсоветаў—2927 комсамольцаў і 8.440 чалавек беспартыйнай моладзі. Членамі прэзідыумаў сельсоветаў працуюць 899, сакратарамі РВК—4 комсамольцы, старшынямі местачковых советаў—25.

З часу мінулых перавыбараў советаў ленінскі комсамол Совецкай Беларусі значна павысіў свой аўтарытэт сярод рабочых і калгаснікаў. Ён праявіў сябе верным і дастойным памочнікам ленінскай партыі ў барацьбе за выкананне промфінплана на вытворчасці, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў.

Намі дасягнуты значныя рэзультаты пры выкананні калгасамі і аднаасобнікамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Дзесяткі і сотні членаў ленінскага комсамола і актывісты з радоў беспартыйнай моладзі змагаліся за датэрміновае выкананне плана хлебапаставак.

Аб гэтым сведчыць масавае спаборніцтва маладых брыгадзіраў і старшынь калгасаў, ахапіўшае 130 старшынь і 420 маладых брыгадзіраў, 35 брыгадзіраў і 8 маладых старшынь калгасаў Хойніцкага раёна скончылі хлебаздачу раней тэрміна (15 жніўня). Вельмі добра працавалі 18 брыгадзіраў калгасаў Капыльскага раёна і 20—Дзяржынскага. З спаборнічаючых асабліва праявілі сябе 15 лепшых маладых брыгадзіраў. У тым ліку **Гурыновіч** — старшыня калгаса «Зара свабоды», Капыльскага раёна, **Кармэн**—брыгадзір калгаса «Комунар», Капыльскага раёна, **Антон Казей**—брыгадзір калгаса «Звязда», Дзяржынскага раёна, **Надзея Палатка**—брыгадзір калгаса «Перамога», Талачынскага раёна, **Параскоўя Цімошчанка**—брыгадзір калгаса «Чырвоны маяк», Рагачоўскага раёна і інш.

«Лік выбаршчыкаў за апошнія тры гады ўзрос больш, чым на 10 мільёнаў чалавек. Гэта ўзросшая пры совецкай уладзе і выхаваная ленінскай партыяй, комсамолам, профсаюзамі і советамі моладзь нашай краіны, дасягнуўшая за гэты час выбарчага ўзросту, упершыню прыме ўдзел у перавыбарах». (З адозвы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР аб выбарах у советы).

Па БССР у гэтым годзе ў выбарах прыме ўдзел каля 3 мільёнаў працоўных. 460,000 маладых рабочых і работніц, калгаснікаў і калгасніц, інтэлігенцыі, студэнцтва ўпершыню ў гэтым годзе будуць выбіраць і выбірацца ў органы дыктатуры пролетарыята—советы.

Многія з іх безумоўна змогуць апраўдаць сябе на адказнейшай работе ў органах пролетарскай дыктатуры—у советах. У радах ленінскага комсамола выхаваўся не адзін дзесятак комсамольцаў, прайшоўшых шлях ад батрака да прафесара, ад некваліфікаванага рабочага да інжынера і тэхніка, ад бедняка-селяніна да высокакваліфікаванага совецкага інтэлігента. **Толькі ў Совецкім Саюзе партыя і ўрад акружаюць пролетарскую і калгасную моладзь выключнымі клопатамі, выключнай увагай і даюць ёй усе магчымасці аўладаць вышынямі навукі, культуры і тэхнікі.**

У часе перавыбараў советаў наша моладзь, згуртаваўшыся вакол комсамола, павінна яшчэ раз прадэманстраваць сваю бязмежную адданасць нашай вялікай Усесаюзнай Комуністычнай партыі, сваю бязмежную адданасць правадыру і настаўніку—генію сусветнага пролетарыята таварышу **Сталіну.**

Асноўныя задачы, якія стаяць перад комсамолам Беларусі ў перавыбарчую кампанію 1934-35 года, выцякаюць з агульных задач, пастаўленых перад краінай нашай партыяй і яе XVII з'ездам.

На соцыялістычнай вытворчасці, па бульбулі комсамол і наша моладзь павінны праявіць сябе, як перадавы атрад, які змагаецца за выкананне плана вытворчасці, за асваенне новых заводаў і фабрык, за ўшчыльненне рабочага дня. Комсамолу ва ўсякай рабоце трэба праявіць свой пачын, ініцыятыву і энергію, быць перадавой, ударнай брыгадай. Так вучыў нас В. І. Ленін.

У арганізаваных вытворчых паходах імя VII з'езда советаў комсамольска-маладзёжныя брыгады павінны быць у першых радах. Гэта-ж не ў меншай ступені адносіцца і да моладзі ў калгасах і саўгасах. Там комсамол павінен змагацца за гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, за большэвіцкія калгасы і заможных калгаснікаў, за ўздым калектывізацыі БССР.

Асаблівыя клопаты трэба праявіць у **павышэнні культурнага ўзроўню жыцця рабочага і калгасніка.** Клапаціцца аб чыстаце, культурным адпачынку, карысным відовішчы, вясёлых забавах, клапаціцца аб вучобе рабочых і калгаснікаў—істотная задача ленінскага комсамола.

Разам з гэтым трэба памятаць, што БССР прыдзецца адбіць першы ўдар заходніх імперыялістаў на нашу соцыялістычную радзіму. **Узмацненне абароназдольнасці нашай краіны, баявой магутнасці нашай слаўнай Чырвонай арміі, морскага і паветранага флота, акуратнае выкананне шэфскіх абавязацельстваў перад імі з'яўляецца адной з важнейшых задач комсамола ў перавыбарчую кампанію 1934-35 года.**

«Дапамога комсамола і моладзі ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінна быць сканцэнтравана на ажыццяўленні суровай рэвалюцыйнай законнасці, узмацненні дзяржаўнай дысцыпліны, знішчэнні ўсякіх праяўленняў бюракратызма і цягаціны; з гэтай мэтай павінна быць павышана і ажыўлена работа розных секцый советаў, дэпутацкіх груп, пашырана практыка соцыялістычнай сумяшчальнасці. Комсамольскія арганізацыі павінны дапамагчы советам у іх рабоце па добрабыту школ, больніц, дзіцячых дамоў, лазняў, жылля, па павышэнню якасці работы мясцовага транспарта, рамонту дарог і мастоў». (З пастановы ЦК ВЛКСМ).

У падрыхтоўцы да перавыбараў советаў і ў правядзенні саміх перавыбараў значная частка работы павінна легчы на плечы комсамола. Нельга прызнаць дастатковай актыўнасць комсамола і моладзі Совецкай Беларусі ў перавыбарах советаў мінулых гадоў. Трэба цвёрда памятаць, што цяперашняя перавыбарчая кампанія—гэта вялікі палітычны экзамен для ленінскага комсамола Беларусі. І ён павінен выйсці з гэтага экзамена ўзбагачаным вопытам, са значна вырасшым аўтарытэтам у рабочых і калгасных мас нашай рэспублікі.

У парадку падрыхтоўкі да перавыбараў комсамольскія арганізацыі павінны правесці агляд пярэдніх комсамольскіх арганізацый совецкіх органаў па пытанню паляпшэння якасці іх работы. Сходы арганізацый павінны дэтальна абгаварыць зварот ЦВК Саюза ССР і давесці яго да шырокіх працоўных мас. Трэба паставіць на сходах справаздачы комсамольцаў—дэпутатаў совета, вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу ў перавыбарах і кандыдатуры комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў склад советаў.

Трэба дабіваца таго, каб **перавыбары ператварыліся ў сапраўды ўсенароднае свята.** Дабіцца стопроцантнай яўкі выбаршчыкаў па сходы — абавязак кожнага комсамольца. У совет выбіраць побач з комуністамі, беспартыйнымі рабочымі і калгаснікамі лепшых прадстаўнікоў комсамола і моладзі.

«Лёгкая кавалерыя» павінна аказаць вялікую дапамогу ў перавыбарах: праверыць выкананне ранейшых наказаў советам, дапамагчы выявіць класава-варожыя, кулацкія элементы, якія будуць імкнуцца праезці ў рады выбаршчыкаў і ў советы.

Прыгожае мастацкае афармленне горада, прадпрыемства, мястэчка, калгаса, вёскі ў дні выбараў таксама павінна быць справай комсамола. Вуліцы, дамы, грамадскія будынкі трэба упрыгожыць плакатамі, дыяграмамі, выстаўкамі, характарызуючымі работу советаў і перамогі соцыялістычнага будаўніцтва. Неабходна арганізаваць самадзейныя брыгады па абслугоўванню выбараў спектаклямі, выступленнямі, кіно і т. д.

Совецкі Саюз пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна прыходзіць да перавыбараў советаў з ліганнікімі дасягненнямі. Гэтыя дасягненні заваяваны ў жорсткай барацьбе з астаткамі класава-варожых элементаў, з астаткамі кулацтва. Вораг разбіт, але канчаткова не дабіт. І ў перавыбарчую кампанію советаў замаскаваныя ворагі, буржуазныя нацыналісты і кулакі напрабуюць пралезці ў органы дыктатуры пролетарыята—у советы. Комсамол павінен праявіць максімальную класавую пільнасць, каб умець своечасова выкрыць перад шырокімі працоўнымі масамі махінацыі класавых ворагаў.

Перавыбары советаў у БССР, як і ва ўсім Саюзе, неразрыўна звязаны з выкананнем гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад краінай. Поўнае выкананне абавязацельстваў калгасаў і аднаасобнікаў перад дзяржавай, поўнае выкананне планаў ільнозагатовак, мясапаставак і інш. будзе адным з лепшых паказальнікаў ступені падрыхтаванасці да правядзення перавыбараў советаў і ўдзелу ў іх комсамола.

Комсамол Совецкай Беларусі выканае ўсе гэтыя задачы, калі будзе жыць штодзённымі клопатамі аб кожным маладым рабочым, аб кожным маладым калгасніку, акружыць яго ўвагай і дапамогай, калі ён будзе тысячамі ніцей звязан з самымі шырокімі масамі беспартыйнай моладзі.

Трэба цвёрда памятаць словы тав. **Косарэва:**

«Ні адзін малады рабочы не можа быць па-за полем нашага ўзроладзі, яе ленінскае выхаванне, арганізацыя барацьбы моладзі за справу Леніна-Сталіна ёсць і будзе святым абавязкам ленінскага комсамола».

ДА XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРА

Дзеўята ПЕРШАЙ пяцігодкі

ЛЕПШЫЯ ЛЮДЗІ ФАЕРЫКІ

Лепшыя людзі фабрыкі кавалі яе перамогі, выводзілі шоўкавую ў рады перадавых соцыялістычных прадпрыемстваў. Гэтых знатных людзей павінны ведаць усе працоўныя нашай краіны.

На здымку звер ху ўніз: Дырэктар фабрыкі тав. ЧОЛАХ. Сакратар партко ма тав. ДРАБІНСКІ. Старшыня фабкома тав. ІВАНОЎ ФЕДЗЯНІНА МАРУСЯ — лепшая ўдарніца, аўладала складанейшай кваліфікацыяй каліброўкі фільер. ЛУКАШЭВІЧ — слесар механічнай майстэрні ЦЭЦ, лепшы ўдарнік-рацыяналізатар.

1. „Трэба сцяг трымаць умеючы"

Дзень 8 кастрычніка быў урачыстым днём для пятай брыгады прадзільнага корпуса. Гэта быў юбілейны дзень. Чатыры месяцы таму назад брыгада атрымала чырвоны пераходны сцяг і з таго часу нікому яго не аддае. Урачыстасць і значэнне для 5-й брыгады гэтага дня павялічвалася яшчэ і таму, што яна з'яўляецца чырвонасцяжнай брыгадай чырвонасцяжнага корпуса тройчы чырвонасцяжнай, буйнейшай у СССР шаўковай фабрыкі—дзеўяцігадовай першай пяцігодкі; яна—лепшая брыгада ў сям'і пяцітысячнага рабочага калектыва.

Вось чаму рабочыя пятай ўдарнай парашылі адзначыць гэты дзень юбілейным вечарам і запрасілі на яго гасцей з іншых брыгад і цэхаў.

У вызначаны загадзя час сабраліся юбіляры і госці ў адным з пакояў сталовай за чашкай чаю. Сабраліся яны не толькі для таго, каб павячэраць. Не. Трэба было абмяняцца вопытам, дапамагчы адстаючым, а таксама і сабе .за бяспечыць святкаванне чарговага юбілея.

Змены інжынер тав. Длугі, прыкметна хвалюючыся, расказаў удзельнікам вечара аб тым, як іх брыгадай была заваявана перамога. Затым пачалі выступаць радавыя юбіляры ды госці.

— Быў час,—прыкмячаецца тав. Сукач,—калі даваў я да 8 проц. браку, а, між іншым, лічыўся ўдарнікам...

І расказаў т. Сукач, як да іх у брыгаду ўпершыню прышоў новы зменны інжынер тав. Длугі і як яму давялося разгінацца з карткай ударніка. Сорамна і балюча стала. Але нічога не зробіш: вінават. І пачаў тады Сукач пільна прыслухоўвацца да парад спецыялістаў, да машыны лепш прыглядацца... Адным словам, узяўся як след за работу. І зараз яго верацёны не ведаюць браку.

А бывала ўсе гультаі казалі, што тав. Длугі занадта крута ўзяў ся. Яно праўда—дысцыпліна цры ім стала лепшай. Але не трэба за бываць і таго, што тав. Длугі ні разу не прамінуў скарыстаць воль най хвіліны, каб растлумачыць рабочаму, як трэба працаваць.

А вось комсамолец Крывашэін пытанне паставіў па-свойму:

— Вы лепш скажыце, ці маем мы наогул права не быць першымі, калі ў нашай брыгадзе больш дваццаці фабзайцаў?

— Навошта-ж нас тады вучылі?

— Яно, канечне, гэта ўсё правільна,—нібы згаджаецца старшы рабсты другой, адстаючай брыгады тав. Агееў,—а усё-ж нам сорамна быць ззаду... Мы толькі ўчора ўзяліся выкрываць у сябе інжэўдарнікаў, і ўжо сёння ёсць разультаты. А каб раней?..

Па праўдзе кажучы, брыгаду Агеева наўрад ці можна назваць адстаючай, хоць яна па якасці займае амаль апошняе месца. Трэба-ж мець на ўвазе тое, што гутарка ідзе не аб адставанні на дзесяткі, а толькі на палову-чвертку процанта, што месца брыгады ў спаборніцтве вырашаецца такімі адхіленнямі, як сотая частка процанта. Трэба-ж мець на ўвазе, урэшце, і тое, што гутарка ідзе аб такім прадпрыемстве, якое ўжо некалькі год займае адно з першых месц не толькі сярод прадпрыемстваў БССР, але і ўсяго Саюза. Магілеўская шаўковая мае некалькі пераходных сцягаў рэспубліканскага і саюзнага значэння. І нядарма так заўзята аплядыравалі рабочыя свайму старэйшаму таварышу—майстру комуністу Бажанаву, калі той сказаў:

— Трэба, браткі, сцяг трымаць умеючы!

2. Размова... рукамі

Гэта толькі зараз фабрыка з дня ў дзень, з квартала ў квартал, без штурмаў і рыўкоў перавыконвае план. Гэта зараз на фабрыцы якасць ацэньваецца не толькі па моцнасці і цэльнасці кожнага валаконца ў нітцы (гэта ўжо асвоена), але і тым, наколькі аднатонны шоўк, наколькі ён добра фарбуецца і ці няма на ім плям. А быў час, калі аб гэтым не думалі, бо не маглі думаць...

Моцна памятны старым кадравікам фабрыкі трыццаты год. Вясной тады пачала працу вопытная ўстаноўка—фабрыка ў мініяцюры. А з восені, з окцябрскіх свят, уступіла ў строй і «вялікая вытворчасць». Гэта быў самы цяжкі год у гісторыі фабрыкі. Да складаных машын, варштатаў і абсталявання, прадстаўляючых сабой вышэйшае дасягненне тэхнічнай мыслі, прышлі людзі, якія ў лепшым выпадку, мелі раней справу з прымітыўнымі такарнымі варштатамі, кронцыркулямі, напільнікамі, а то і зусім з адналямешным плугам. Праўда, некаторыя з іх пабылі некалькі месяцаў на курсах, але-ж затое ім давялося з першых дзён сваёй работы на фабрыцы заняць камандныя пасты: вучыць навічкоў, а яшчэ больш — самім вучыцца.

Тады яшчэ на шаўковай працавалі спецыялісты з Германіі—інжынеры, тэхнікі, кваліфікаваныя майстры. І даводзілася, як кажуць цяпер на фабрыцы, «немцам у рот глядзець»—што скажуць, тое, і закон. Цяперашні старшыня фабкома, адзін з лепшых майстроў фабрыкі, а ў былым слесар-чыгуначнік, тав. Іваноў многа чаго мае ўспомніць аб тых днях:

— Мне давялося працаваць на мантажы насоснай і яе асвойваць з нямецкім майстрам Раушам. Задача была такая: пераняць ад яго навыкі ў рабоце. А тут—ні я слова па-нямецку, ні ён—па рускі. Цяжка прыходзілася.

Спачатку тав. Іваноў выконваў усё, што яму загадваў Рауш. А пасля, калі стаў лепш прыглядацца да работы, да механізмаў, бачыць, што майстар часта сам блытаецца. Трэба было неяк упершыню прамываць насосікі прадзільнай машыны. Рауш і кажа Іванову: «Давай разбярэм усе насосікі, высыплем дэталі ў ванны і будзем перамываць усе разам». Таму моцна ў галаву засела думка: перабліцем дэталі, тады ні аднаго насосіка не збярэм. Паспрачаліся крыху, а пасля, каб уважыць майстра, Іваноў згадзіўся для пробы разабраць 10 маленькіх складаных механізмаў. Прамылі і... палову насосаў не ўдалося сабраць. Тады толькі Рауш пераканаўся, што яго вучань меў рацыю, і пачаў да Іванова адносіцца ўжо з большай павагай.

На фабрыцы і зараз яшчэ свежы ў памяці старых кадравікоў такі прыклад. Нямецкі майстар Альтнер, будучы ў адпачынку ў Нямеччыне, прывёз адтуль новы спосаб хларыравання чорнага шчолаку. Прывёз, але прымяніць яго не змог, бо ведаў рацыят «на-вока», не ведаў навуковых абгрунтаванняў. І толькі тады, калі туманныя довады і апавяданні Альтнера былі распрацаваны нашым самавучкай інжынерам Марэевым, новы спосаб хларыравання быў ужыт і даў бліскучыя вынікі.

Пасля далёка не адной такой буйнай перамогі нашых спецыялістаў замежныя кансультанты пачалі свае кансультацыйныя функцыі выконваць своеасабліва:

— Дык як па-вашаму, трэба гэта зрабіць? Ага, так? Ну, што-ж... бадай гэта будзе правільна...

Адным словам, дагавор з замежнымі спецыялістамі, па якому яны павінны былі «пабудаваць, асвоіць прадпрыемства і даць адпаведны сартаж» не быў выкананы. І невыкананы таму, што маладыя нашы інжынеры і тэхнікі палічылі гэта немэтазгодным.

3. Крэпасці, якія не ўстаялі...

Ішлі дні. З месяца ў месяц павялічвалася колькасць уступіўшых у строй агрэгатаў, машын. Фабрыцы прад'яўлялися ўсё большыя і большыя запатрабаванні.

А тут, як на зло, што ні дзень, то новы нечаканы прарыў: то Бел дрэс току не дае, то матэрыялу няма, то таго, то другога не хапае. Хоць ты работу спыняй.

—Бывала,—кажа былы майстар ксантатнага цэха, а зараз начальнік ЦЭЦ тав. Замскі,—бывала загрузіш бзраты цэлюлозай, уключыш маторы, каб бараты круцілі-ся, а тут—бах!—сваліце матухла, а



Двор шаўковай фабрыкі.

маторы сталі, сталы і бараты. А кожная мінута прастою—гібель сыравіны. Аднак-жа не дапускалі панікі, упоцемку бараты круцілі рукамі. А бывала і горш.

Аднойчы нам прыслалі для хімкорпуса партыю каустычнай соды. Адкрылі шаўканікі банкі і ахнулі—сода не светлая, а чырвоная. Гэта значыць, празмерна вялікі ў ёй процант жалеза і яна для прымянення непрыгодна. Што-ж рабіць? Прымяняць яе нельга, а без яе фабрыка не можа працаваць. Выйсці і з гэтага становішча. І на гэты раз дакажа Марэеў каштоўным вынаходствам, якое дало магчымасць ачысціць соду ад шкодных прымесей.

Хіба будзе забыт так званы «мыльны шоўк»? Больш двух год біліся над ім, ніяк мыльнага налёту не маглі звесці з валакна. А ў кніжках пра гэта нідзе нічога не сказана. Ночы недасыпалі, не адзін дзесятак лістоў паперы сп'ялі ўдоўж і ўпоперак склатанымі формуламі. Урэшце маладому інжынеру Гурэвічу ўдалося знайсці выхад: шоўк стаў чыстым.

Так з дня ў дзень спецыялісты, майстры і рабочыя, захопленыя пафасам асваення вышынь тэхнікі, складанейшых механізмаў і вытворчых працэсаў, штурмавалі крэпасці труднасцей, бар'ёры непаладак, штурмавалі навуку. І гэтыя крэпасці не ўстаялі пад напорам непераможнай творчай сілы і энергіі рабочага калектыва.

Сотні ўдарнікаў, пераматаючы не прадбачаныя труднасці, стваралі каштоўнейшую прадукцыю, стваралі фабрыку. А яна—асяродак высокаарганізаванай соцыялістычнай працы—стварала новых людзей.

— Хльстуноў: былы батрак з-пад Старадуба, комсамолец, а зараз—член ВКП(б), майстар ксантатнага цэха, змены інжынер...

— Арцюхоў: землякоп, работы шаўковай, памочнік майстра прадзільнага цэха, майстар, дырэктар аднаго з буйнейшых у БССР торфазаводаў—важнейшага цэха шоўкавой фабрыкі...

— Брыль: у былым кур'ер ВСНГ Бел., а зараз—працуючы па шаўковай, атрымаў дыплом тэхніка, быў зменным інжынерам. Працуе намеснікам начальніка корпуса, мае свае друкаваныя навукова-тэхнічныя творы...

—Федзяніна: хатняя гаспадыня, прыбіральшчыца ў гасцініцы, работчая шаўковай, а зараз аўладала адной з складанейшых кваліфікацый і працуе каліброўшчыцай фільер—малюсенькіх прылад прадзільнай машыны з мікраскапічнымі дэталямі; член раённага камітэта партыі...

— **Каган Люба... Варанчук... Іваноў ... Фрыдлянд Маня... Астраў... Зайцаў... Парэпка... Замскі** і многа, многа іншых сапраўдных ударнікаў, дастойных кіраўнікоў і арганізатараў соцыялістычнага гіганта выраслі за гэты кароткі час на шаўковай.

І кожны з іх бачыць у фабрыцы сваё дзеўяцігадовае, і кожны з іх лічыць сябе дзеўяцігадовым фабрыкі.

4. Што такое $C_6H_{10}O_5$?

Было гэта ў 1932 г. Тады ўжо тав. Брыль нядрэнна ведаў вытворчасць прадзільнага корпуса і выконваў абавязкі майстра. Работа ішла добра. І калі да яго прыслалі из практыку студэнтаў ленін градскага хіміка-тэхналагічнага інстытута і маскоўскага ВТНУ, тав. Брыль хутка ўцягнуў іх у работу, перадаваў іх свае навыкі арганізатара-прадзільшчыка. І абодва ба кі былі ўзаемна задаволены. Але... так было да таго часу, пакуль ста жыроўка студэнтаў абмяжоўвалася практычнай работай. А вось калі прышлося пазнаёміцца з сутнасцю таго ці іншага працэсу, навукова абгрунтаваць яго, тав. Брыль адчуў сябе не зусім добра. І не дзіва: прывычныя насосы, ванначкі, фільеры, цэнтрафугі схаваліся за густой сеткай складаных хімічных формул і законаў. А, як вядома, узброеным вокам скрозь гэту сетку нічога нельга ўбачыць...

І тады тав. Брыль рашыў падыйсці да фільер, віскозы і ксантагенатаў з другога боку. Пачалася крапатлівая работа над кніжкай. Тым часам пры фабрыцы быў арганізаван тэхнікум, дзе можна было займацца без адрыву ад вытворчасці. Тав. Брыль, не трацячы ні хвіліны, як кажуць, абодвума рукамі ўхапіўся за гэту справу. Кожны крок і кожная хвіліна былі строга ўлічаны. Трэба было ўмець сумяшчаць вялікую і адказную работу на вытворчасці з не менш вялікай вучобай. Давялося «ігнараваць» кіно, тэатр, нават белетрыстыку. Але затое праз пэўны час былы кур'ер ВСНГ атрымаў дыплом высокакваліфікаванага тэхніка. Прычым на гэтым не пастаўлена крапка. Тав. Брыль ушэ нец, што з цягам часу ў яго будзе заслужаны ўпартай працай і вучобай дыплом інжынера.

Або ўзяць тав. Хльстунова. Яму на фабрыку давялося прыйсці праз доўгія і цяжкія гады батрацтва ў старадубскага абшарніка Дзятлава. За плячыма былі—вопыт арганізатарскай комсамольскай работы ў вясковай ячэйцы, палітграмата, вынесеная з Чырвонай арміі і—усё. Другім хоць пашэнціла перш чым стаць на работу навучыцца на фабрычных курсах, а Хльстунову давялося стаць да варштата ў ксантатным цэху без усякай падрыхтоўкі.

Не раз рукі дрыжэлі і падкошваліся ногі, калі ён браўся за работу. Як-ніяк, а чалавеку ні разу ў жыцці не прыходзілася бачыць такога буйнага прадпрыемства, такіх складаных машын і абсталявання. Гэтага мала. Хльстунова літаральна «глушылі» незнаёмыя і закавырыстыя словы вытворчага лексікону: ксантазенат... каусцік... віскоза... шчолачы...

Справа цёмная. Самому, відаць, не ўзяць гэтай крэпасці. Прышлося звярнуцца за дапамогай да знаёмага інжынера комуніста Трафімава. Але і гэтага было мала. І толькі вясной трыццаць другога года, калі Хльстуноў пачаў навучаць фабрычны тэхнікум, справа пашла на лад. Аднак, не надоўга. Неўзабаве выбралі яго ў цэху сакратаром партыйнай ячэйкі, а пасля партком паслаў на некалькі месяцаў у падшэфны Білеўскі сельсавет. Вучоба сарвалася. І толькі сёлета Хльстуноў зноў з ранейшай напорыстасцю ўзяўся навярстаць прапушчанае. Зараз ён працуе зменным інжынерам, парторгам цэха, наведвае тэхнікум і вучыць маладняк, старанна растлумачвае сваім вучням, што такое $C_6H_{10}O_5$...

5. „Прашу разгледзець маё вынаходства"

Ёсць на фабрыцы ўдарнікі, да якіх рабочы калектыў адносіцца з асаблівай пашанай. Гэта людзі, якія найбольш выразна адлюстроўваюць волю калектыва, гэта — рабочыя вынаходцы і рацыяналізатары. У кожным цэху, у кожнай брыгадзе добра ведаюць імёны **Парэпкі, Белякова, Феонфістава, Кавалёва, Марозава, Турына** і яшчэ не адзін дзесятак падобных ім. І дырэктар, і інжынер, і комуніст, і рабочы добра ведаюць, што творчая работа гэтых людзей адыгрывае немалаважную ролю ў заваяванні фабрыкай аднаго з першых месц у БССР і Совецкім Саюзе.

Толькі па аднаму прадзільнаму корпусу і толькі за адзін квартал бягучага года рабочыя рацыяналізатарскія прапановы і вынаходствы даюць гадавую матэрыяльную эфектыўнасць у 20.000 рублёў.

Калі тав. Парэпка прышоў на фабрыку, яго прызначылі ў насосную майстэрню. З уласцівым яму запалам ён узяўся за даручаную справу і моцна палюбіў яе. І не толькі палюбіў. Парэпка пільна прыглядаўся да кожнага руху свайго майстра Іванова, кожнай работніцы і рабочага. Яго цікавіла ўсякая дробязь і Парэпка літаральна засыпаў пытаннямі ўсіх тых, каго ён лічыў падрыхтаваным больш за сябе.

— Чаму гэта так, а ці нельга было-б інакш?

Аднойчы кінулася яму ў вочы, як работніца ўручную напаўняла віскозай маленькія шкляначкі для праверкі магутнасці насосікаў прадзільнай машыны. Справа гэта патрабуе ад рабочага выключнай дакладнасці, уважлівасці і напружанасці.

— Няўжо гэта адзіны спосаб? — задумаўся Парэпка: — а ці нельга было-б інакш?.. І ён стаў яшчэ пільней прыглядацца да працэса.

І калі раней ён ночы аддаваў для сну, то пасля наглядання за працэсам апрабіравання не лена ваўся начамі праседжваць над уласнымі чарцяжамі і вылічэннямі. Прайшоў некаторы час, і Парэпка, як толькі выпадзе вольная мінута, хадзіў у майстэрню і нешта старанна майстраваў. Спачатку асобныя рабочыя кпілі з яго выдумак.

Але насмешкі ўшчэнт разбіваліся аб настойлівасць вынаходцы. Ён быў упэўнен у неаўмозе. І калі яго работай зацікавіліся спецыялісты і дырэкцыя прапанавала прапановую дапамогу, Парэпка адмовіўся: «паспею», думаў ён. «атрымаць грошы, а пакуль буду канчаць пачатую справу». І закончыў. Апарат выйшаў на славу. Пры дапамозе яго ўдвая павялічылася прадукцыйнасць працы на апрабіраванні. Апрабацыя рабілася больш дакладна, значна была аблегчана праца рабочага, а фабрыка мела пэўных 4.000 руб. у год эфекту. Парэпка-ж атрымаў 800 руб. аўтарскіх. Але на гэтым справа не скончылася. Экспертная камісія даручыла вынаходцы абучыць рабоце на новым прыборы некалькіх работніц. Парэпка і гэту задачу выканаў. А зараз ён моцна думае над тым, каб яго апарат мог працаваць аўтаматычна, не абцяжараваў рабочніка назіраннем за ручным секундамерам.

Так безупынна, напорыста і энергічна працуе творчая мысль лепшых сыноў рабочага калектыва. А стол загадчыка вытворчасці кожны дзень папаўняецца новымі і новымі заявамі:

— Прашу разгледзець маё вынаходства...

6. Процанты ствараюцца людзьмі

Гэта было паўгода назад. Фабрыка апынулася ў катастрафічным становішчы — процант прадукцыі першага гатунку імкліва спаўзаў уніз. Было 40, потым 30, потым 20 і, урэшце, 6. І вось тады ў партком прышла група кіруючых работнікаў і бездапаможна канстатавала:

— Становішча бязвыхаднае. Запатрабаванні з кожным днём павялічваюцца, а наша фабрыка не разлічана на іх задаваленне. Усяць якасць няма ніякай магчымасці.

Усё.

Сакратар парткома тав. Драбінскі агласіў нараду закрытай і, не адкладваючы справы, склікаў экстранае пасяджэнне парткома з удзелам пахавых партарганізатараў. Усё ці не. Усё? — так было пастаўлена пытанне. І партыйны актыў адказаў:

— Не, не ўсё. Якасць можа, павінна і будзе павышана і для гэтага ёсць надзейная і пэўная ўмова — жаданне рабочага калектыва. Але няма яшчэ патрэбнага кіраўніцтва.

На другі дзень у кабінеце тав. Драбінскага за чашкай чаю сабраліся прадстаўнікі рашаючых цэхаў — і тыя, хто перавыконвае задание па якасці, і тыя, хто ганебна зрывае яго. **Завязалася** жывая таварыская гутарка, абменьваліся вопытам, дзяліліся меркаваннямі. А кончылі тым, што перадавыя рабочыя ўзялі на сябе абавязак навучыць адстаючых працаваць. Разгарнулася сапраўднае спаборніцтва паміж асобнымі рабочымі, а пасля паміж брыгадамі і цэхамі. На аснове творчай ініцыятывы ўдарнікаў разгарнулася барацьба за якасць. У гэту барацьбу быў уцягнут увесь рабочы калектыў. Процант прадукцыі першага гатунку з кожным днём павышаўся. «Навукова абгрунтаваныя доказы» панікёраў згубілі пад сабою грунт. Зараз фабрыка дае першага гатунку, замест 50 проц. па плану, 60. Ніхто больш не адважваецца сказаць, што магчымасці прадпрыемства не разлічаны на задаваленне ўсё ўзрастаючых запатрабаванняў.

Гэты факт — адзін з характэрных для ўсёй сістэмы работы партыйнага камітэта фабрыкі. Хто больш-менш грунтоўна азнаёміцца з работай парткома, таму не цяжка заўважыць, што ў аснову яго работы пакладзены сапраўды большэвіцкія прынцыпы:

Усёй БССР вядома ініцыятыва партыйнай арганізацыі шаўковай па ўкараненню ў практыку масава - выхаваўчай работы палітдзён. Не раз на старонках нашых цэнтральных газет можна было прачытаць аб тым,, як гэты партыйны калектыў арганізаваў вучобу і выхаванне комуністаў, рабочага актыва. Усё гэта характэрныя, але не адзіныя прыклады таго, як партыйная арганізацыя фабрыкі змагаецца за ажыццяўленне указанняў тт. Сталіна і Кагановіча. Нямала зрабіў партыйны камітэт і дырэкцыя у асобе тав. Чолаха для таго, каб рабочы меў на зіму цёплую і ўтульную кватэру, склеп для гародніны, каб ён мог гадаваць сабе парасё.

7. „Хіба можна параўноўваць"!

Вось у гэтым вялікім і здаровым калектыве расце дастойная змена старым кадравікам - ударнікам. Ды яшчэ якая! Яна, гэта змена, спраўляецца не толькі хутка пераймаць вопыт старых, авалодваць тэхнікай вытворчасці, вучыцца і цярпліва «затыкаць за пояс» старыкоў. Яна пашла далей. Фабрычную бібліятэку рэгулярна наведвае каля 2.000 чытачоў, а з іх не менш паловы моладзь. Яшчэ зусім нядаўна на фабрыку быў прывезен планер, а ўжо 18 юнакоў—сартоўшчыца **Райхель**, слесар **Свістуноў**, тэлефаністка **Казлоў, Доўбуш, Шабанаў, Саульчык** і інш.—зрабілі па 25-30 палётаў, вытрымалі іспыты на планерным справе па «добра». Звыш 1.000 маладых рабочых, работніц і служачых наведваюць тэхнікумы, рабфакі, рознастайныя курсы і гурткі.

Так рабочы калектыў выкоўвае сабе змену. Але гэта не ўсё. Дзесяткі рабочых маюць цесную сувязь з вёскай, адкуль яны пару год таму назад прышлі на фабрыку. І гэта сувязь робіць немалы ўплыў на пашырэнне і ўкараненне калгасаў, на выхоўванне і там новых людзей. Прапрабуйце запытаць аб гэтым рабочага «канаткі» тав. Андрейчыкава, і ён вам з ахвотай расскажа, як яму давялося напрацаць нямала часу, напісаць не адзін ліст, каб «завербаваць» свайго шваграа ў калгас:

— Усё не хацеў, нечага баяўся. А калі я пачаў яму прыкладам даказваць, наколькі карысна і добра жыць у калгасе — падумаў, падумаў і згадзіўся. Не напрэш-жа супроць фактаў. А цяпер дзякуе мне за тое, што я яму паказаў добрую дарогу да заможнага жыцця.

І вось, калі запытаем у старога рабочага, старэйшага майстра тав Бажанава, які добра ведае «смак» капіталістычных прадпрыемстваў, якую ён бачыць розніцу ў жыцці і працы рабочага пры параўнанні сваёй фабрыкі з тымі, дзе яму давялося працаваць да рэволюцыі то ў адказ ён здзівіцца і скажа:

— Хіба-ж гэта можна параўноўваць...

* * *

Было-б няправільна думаць, што на фабрыцы ўсё добра, што там няма ніякіх недахопаў. Яны ёсць. Але хіба не ясна, што там, дзе ёсць такі здаровы калектыў, дзе людзі не ўтойваюць сваіх недахопаў і ўмеюць з імі змагацца, яны, гэтыя недахопы не страшны, бо іх яны перамогуць.

ЕІТ. ДАЛЬ.

ЛЕПШЫЯ ЛЮДЗІ ФАБРЫКІ

Лепшыя людзі фабрыкі кавалі яе перамогі, выводзілі шоўкавую ў рады перадавых соцыялістычных прадпрыемстваў. Гэтых знатных людзей павінны ведаць усе працоўныя нашай краіны.

На здымку звер ху ўніз: БРЫЛЬ—адзін з лепшых ударнікаў аўладення тэхнікай, былы майстар, зараз намеснік начальніка корпуса, аўтар раду рацыяналізатарскіх прапаноў і папулярнай навукова -тэхнічнай брашуры. БЕЛЯКОЎ — майстар механічнай майстэрні прадзільнага корпуса, лепшы ўдарнік фабрыкі, вынаходца і рацыяналізатар. АБРАМОВІЧ — слесар-брыгадзір і механічнай майстэрні, лепшы ўдарнік прадзільнага корпуса. ЛЫСКОЎСКАЯ —комсамолка, лепшая ўдарніца, зогэўка метальнага цэха. СНОПАЎ — старэйшы рабочы фабрыкі, вылучан на работу памочніка загадчыка аддзела параатэплення і вентыляцыі.

СОВЕЦКАЯ ЛІТАРАТУРА—ЛІТАРАТУРА РАДАСЦІ

Вечар рэволюцыйных пісьменнікаў і мастакоў Францыі

ПАРЫЖ, 24 кастрычніка (БЕЛТА) Адбыўся арганізаваны асацыяцыяй французскіх рэволюцыйных пісьменнікаў і мастакоў вечар, прысвечаны першаму з'езду совецкіх пісьменнікаў. На вечары прысутнічала звыш 4 тысяч чалавек.

Старшынёй пад гучныя апладысменты быў выбран вядомы французскі пісьменнік **Андрэ Жыд**. Андрэ Жыд сказаў прамову, якая зрабіла на прысутных велізарнае ўражанне. «Буржуазная літаратура,—сказаў Жыд, — адарвана ад рэчаіснасці. Іншая справа—совецкая літаратура. Літаратурныя творы, народжаныя Окцябрскай рэволюцыяй, натхнёны зусім іншым духам. Ці існуе небяспека,—прадаўжае Андрэ Жыд, —што совецкая літаратура таксама будзе адарвана ад рэчаіснасці. Не, гэтай небяспекі няма, бо мовая літаратура непасрэдна звязана з рэволюцыяй, з яе выходзіць. Совецкая літаратура створыць, несумненна творы вялікай радасці. Тое, што для нас тут з'яўляецца яшчэ ўтопіяй, хутка будзе жывой рэальнасцю ў Совецкім Саюзе. Там расце новы чалавек».

Прыкладна ў такім-жа плане гаварыў і ўдзельнік з'езда совецкіх пісьменнікаў—**Андрэ Мальро.**

Прамовы пісьменнікаў не раз перарываліся апладысментамі і выклікалі ў зале вялікі пад'ём.

Выступіўшы ўдзельнікі з'езда **Ілья Эрэнбург**, французскі пісьменнік і крытык **Позднер** і галандскі пісьменнік **Ласт** расказалі аб вялікай увазе, з якою ўся совецкая краіна сачыла за з'ездам пісьменнікаў, і аб небывалым у буржуазных краінах росце масавай культуры.

Велізарнае ўражанне на ўсіх прысутных зрабіла з'яўленне на трыбуне делегацый ад рабочых-металістаў, чыгуначнікаў, будаўнікоў і інш.

Рабочы завода «Сітроен» зачытаў пісьменнікаў-інтэлігентаў, аразумеўшых бязвыходнасць капіталістычнага тупіка, прыйшоўшы ў рабочыя кварталы, каб устанавіць саюз работнікаў разумовай і фізічнай працы, у барацьбе за новае жыццё і новую культуру.

Гэты заклік выклікаў у зале сапраўдны энтузіязм. Усе 4 тысячы чалавек падняліся са спевам «Інтэрнацыянала». На трыбуне стаялі, перад фронтаўску падняўшы рукі, Андрэ Жыд, Мальро і рад другіх пісьменнікаў, заліваючы галасы з галасамі рабочых у гуках пролетарскага гімна.

ЗНАМЯНАЛЬНАЕ ПРЫЗНАННЕ КВАТЭРНІКА

БЕРЛІН, 24 кастрычніка. (Інфармацыя «Праўды»). Атрыманыя тут замежныя газеты прыводзяць падрабязную справаздачу допытаў арганізатараў марсельскага замаху — **Павеліча і Кватэрніка** — Крамера (у Турыне), апублікаваную ўчора германскім інфармацыйным бюро са значнымі прапускамі. У прыватнасці, германскае агенцтва апусціла наступную вельмі недахопную заяву Кватэрніка аб яго месцапрабыванні за апошні год, шырока цытуемую ў швейцарскіх газетах. Кватэрнік сказаў: «Хутка слюўніцца 10 месяцаў, як я знаходжуся ў эміграцыі. Увесь гэты час я без перапынку правёў у Берліне, дзе мяне хаваў адзін з маіх нямецкіх прыяцеляў».

Як відаць, гэту заяву мела на ўвазе і **«Гамбургер фремдэнблат»**, заўважыўшы ўчора, што некаторая частка паказанняў Кватэрніка «не прадстаўляе цікавасці» для германскіх чытачоў.

Кватэрнік, значыць, прызнаў тое, што так узмоцнена стараецца ўтаіць германскі друк, а іменна, что ён падрыхтоўваў марсельскае забойства, сядзячы ў Берліне.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

✦ Як паведамляюць з Бухарэста, 22 кастрычніка ў Страшэнах каля Кішынева блізкая да нацыянал-сацыялістаў арганізацыя прыхільнікаў Кузы наладзіла яўрэйскі пагром. Фашысты разграмілі сінагогу і многа яўрэйскіх дамоў.

✦ «Сімбун рэнго» паведамляе, што з прычыны недахопу лётнага складу ў японскім флоце, морскае міністэрства рашыла яшчэ да канца бягучага года прыступіць к стварэнню і абучэнню рэзерва лётчыкаў. Большая частка рэзервістаў будзе навербавана са скончыўшых універсітэты і вышэйшыя тэхнічныя школы.

✦ Згодна паведамлення мукдэнскага карэспандэнта агенцтва Сімбун Рэнго, «бандыты» 22 кастрычніка напалі на Цзіцзілун у правінцыі Жэхэ (Унутраная Манголія) і захапілі усіх кіруючых японскіх і манчжурскіх чыноў мясцовых органаў улады, у тым ліку начальніка раёна.

У Соўнаркоме БССР

ПАВЕЛІЧЭННЕ СТЫПЕНДЫЙ СТУДЭНТАМ

СНК БССР пастанавіў пашырыць пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб падвышэнні заработнай платы нізкаплачваемым рабочым і служачым на студэнтаў, якія атрымліваюць стыпендыю да 110 руб. На павеличэнне стыпендый адпушчана 93.100 руб. Павышаная стыпендыя выплачваецца з 1 верасня.

ДОМ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ ІНВАЛІДАЎ

СНК абавязаў наркамат сацыяльнага забеспячэння разам з Чэрвеньскім райвыканкомам арганізаваць у чэрвені з 15 лістапада дом для дзяцей інвалідаў на 100 ложкаў. Для абсталявання дома асігнавана 35.000 руб.

ДАПАМОГА СЕМ'ЯМ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ

СНК БССР павялічыў каштарыс наркамата сацыяльнага забеспячэння на 340 тыс. рублёў на выдачу дапамогі сем'ям прызваных у РСЧА і на персанальныя пенсіі.

АБ ЗІМОВЫМ ПАЛЯВАННІ

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Дазволіць з 28 кастрычніка 1934 года паляванне ў палявым сезоне 1934-35 года на ўсе віды пушнога звера, за выключэннем забароненых згодна пастановы СНК БССР ад 23/VII-1934 г. «Аб правілах і тэрмінах палявання».

2. Прапанаваць усім РВК гэту пастанову апублікаваць у раённым друку.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР А. САЮК'ЯН.
Кіраўнік справаў Совета Народных Камісараў БССР С. ШАБОЛТАС.
22 кастрычніка 1934 г.

НАСУСТРАЧ XVII ГАДАВІНЕ ОКЦЯБРА

⊙ Партком і саўком дрэваапрацоўчага завода імя Молатава арганізуюць на кватэрах лепшых рабочых-ударнікаў 40 вечароў, прысвечаных гадавіне Окцябра. Старыя большэвікі, удзельнікі грамадзянскай вайны, выступаюць з успамінамі. На вечарах будзе праведзена ўшанаванне старых рабочых і пераміраванне ўдарнікаў. Заканчваецца рамонт і мэбліроўка кватэр 12 ударнікаў.

⊙ Да XVII гадавіны Окцябрскай рэволюцыі ў Менску на фабрыцы «Комунарка» і Эльводзе заканчваецца пабудова сталовых. Уступіць у эксплаатацыю новы добра абсталяваны інтэрнат для рабочых-будаўнікоў, пабудаваны па сістэме пакояў —з ложкамі, матрацамі, коўдрамі. 1.400 кватэр уключаюцца ў каналізацыйную сетку. У Віцебску будзе закончан новы комунальны дом на 65 кватэр. У Магілеве да свята прыстасавана сканчэнне будынкаў раду навучальных устаноў.

⊙ У Гомелі будзе заселен новы сёмы корпус пасёлка шклозавода імя Сталіна. У центры пасёлка ўстанаўляецца помнік Леніну.

БІБЛІЯГРАФІЯ

А. Акімовіч. «Незвычайны мядзведзь». Аповесць для дзяцей. Юнгдзетсектар ДВВ. Менск, 1934 г., стар. 66. 11 малюнкаў. Цана 2 р. 20 к. в пераплётам.

Аповесць «Незвычайны мядзведзь» прэміравана на ўсебеларускім конкурсе дзіцячай кнігі зусім заслужана.

Просты, бясхітрасны сюжэт пабудаваны на матэрыяле ўдзелу піонераў у ахове калгаснай уласнасці. Ён разгортваецца з паступовым нарастаннем здаранняў і з кожнай старонкай навышае цікавасць чытача, які з напружаным захапленнем чакае вынікаў прыгод Алёшкі.

Мова аповесці простая, пазбаўленная даўжэзнасцей і фармалісцкіх выкрутасаў і гэта робіць кніжку асабліва карыснай для школьніка. Не трэба было толькі аўтару захапляцца іранічнымі двукоссямі—так, напрыклад, шалаш у адным месцы называецца «хатай» (у двукоссях), у другім ляснікова клець таксама набывае назву хаты, і таксама ў двукоссях. Для юнага чытача такі прыём толькі затрудняе ўспрыняцце думкі.

Буйным недахопам твору мы лічым амаль поўную адсутнасць дванцшафтных апісанняў. Герой аповесці Алёшка—заўзяты натураліст. Ён многа часу праводзіць у лесе. Ён назірае жыццё птушак, ведае кожнае гняздзечка і што ў тым гняздзечку знаходзіцца. Амаль усе падзеі адбываюцца ў лесе, ці ў полі. Тут перад аўтарам раскрываюцца шырачэзныя магчымасці для маляўніцага паказу дзеяцям прыроды для прывіцця ім навыкаў назіральнасці і выхавання пачуцця пекнаты. Гэта можа трохі і павялічыла-б аб'ём аповесці, але значна ўзняла-б яе каштоўнасць. А задача гэта зусім на плячу аўтару. Здолеў-жа ён даць у сваёй аповесці рад каштоўнейшых маляўнічых радкоў, даючых юнаму чытачу ўяўленне аб звычках дзятлоў, ваўкоў і іншых лясных жыхароў.

Тэхнічна кніга выдадзена на радкасць, нядрэнна. Буйны чоткі шрыфт, чысты друк, добрая «вышхімаўская» папера—якраз тое, чаго не хапае нашым дзіцячым выданням.

Л. РОЗЕНБЛЮМ.

Тэатр

АДКРЫЦЦЁ СЕЗОНА У БЕЛАРУСКІМ ТЭАТРЫ ОПЕРЫ І БАЛЕТА

Сёння пастаноўкай оперы **«Пікавая дама»** Беларускі Дзяржаўны Тэатр Оперы і Балета пачынае тэатральны сезон 1934-35 года.

Склад трупы тэатра зараз значна пашыран і ўзмоцнен. Для работы ва пашыран і ўзмоцнен. Для работы ва ў тэатры прыбылі ленінградскія арты тэатры прыбылі ленінградскія арты тэатры тт. **Дзерзеў** (лірыка-драматычны барытон), **Кулегін** (лірыка-драматычны тэнар), **Карпаў і Марціянаў** (бас), **Васкрэсенская і Марц'янава** (меццо-сапрано). Акрамя таго ў тэатры зноў будзе працаваць прапаваўшы ў мінулым сезоне спявак **Бароўскі** (меццо-характэрны тэнар).

Склад балета папоўнен салістам **Нудэ** (Ленінград), **Піно і Власавэй** (Харкаў).

Асабліва шырока папоўнілася музычная частка тэатра. У аркестры пачынаюць працаваць 10 новых высока-кваліфікаваных музыкантаў, сярод якіх канцэртмейстар **Будзішчаў** (скрыпка), саліст **Цімкін** (віалончэль), **Паппеўскі** (габаіст), **Елізараў і Фамін** (валтэрністы).

Дырэкцыя вядзе перагаворы з радам рэжысераў сталічных тэатраў з мэтай запрашэння на работу ў якасці галоўнага рэжысера БелТОБ Таксама вядуцца перагаворы з рэжысерам МХАТ **Мордвінавым** (вядомым беларускаму глядачу па пастаноўцы «Пікавай дамы») і з галоўным рэжысерам Вялікага Тэатра СССР **Лоскім**, якія запрашаюцца для чарговых пастановак опер **«Багема»** Пучыні, і **«Аіда»** Вердзі.

Гэтымі днямі ў Менск прыязджае буйнейшы ў СССР балетмейстар **Ф. В. Лопухаў**, які азнаёміцца з пастаноўкай балетнай справы ў Беларускім Тэатры Оперы і Балета. З Лопухавым вядуцца перагаворы аб пастаноўцы балета **«Лебядзіне возера»**, або **«Капелія»**.

Опера **«Пікавая дама»** будзе ісці да лістапада. 2-га лістапада пойдзе опера **«Князь Ігар»**, затым балет **«Чырвоны мак»**. У канцы лістапада адбудзецца прэм'ера оперы **«Севільскі цырульнік»** Россіні (пастаноўка рэжысера **Барысевіч**, мастацкае афармленне ленінградскага мастака **Шнляева**, кіраўніцтва музычнай часткай дырыжэра **Балазоўскага**), над якой тэатр зараз узмоцнена працуе.

ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ЗОТАЎЦАЎ У ГОМЕЛІ

ГОМЕЛЬ, 25 кастрычніка. (Ад нарэспандэнта «Звязды»).

23 кастрычніка адбылася гарадская канферэнцыя зотаўцаў.

Старшыня горпрофсавета тав. Камаеў расказаў канферэнцыі аб выніках дзевяцімесячнай работы прамысловасці і становішча тэхнічнай вучобы.

На канферэнцыі выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ тав. **Аўгустайціс.**

Дэлегаты канферэнцыі прынялі рад канкрэтных абавязацельстваў па разгортванню тэхнічнай вучобы і паляпшэнню работы прадпрыемстваў з тым, каб заваяваць права на праведзенне ўсебеларускай канферэнцыі зотаўцаў цяжкай прамысловасці ў Гомелі.

Канферэнцыя атрымала прывітальныя тэлеграмы ад ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, «ВсеЗОТ». Пасланы прывітальныя тэлеграмы таварышу **Сталіну, тт. Кагановічу і Гікало, «Правде» і «Звяздзе».**

ПАЛЯШЧУК.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПА БССР

Партканлегія КПК пры ЦК ВКП(б) па Беларускай ССР паведамляе, што 2 і 3 лістапада г. г. у 10 г. раніцы ў г. Гомелі будуць разглядацца парткамісіяй ЦК партсправы наступных таварышоў:

2 ЛІСТАПАДА

Кофман І. Е., Крыжэўцоў А. А., Ларкін Т. О., Зіноўчык Г. К., Гінзбург Л. І., Пефзнер А. С., Астапенка К. В., Жабароўскі І. А., Фельдман Е. Р., Родзькін Л. Г. (гор. Гомель); Ігнатчык Я. З., Залескі В. М. (Хойніцкі р.); Цімошенка Ф. А., Шабалін А. М., Коцяво Ф. А., Караси Г. Т., Канаплянік М. К. (Лоеўскі р.); Васін Б. І., Лапіцкі І. Я., Аваераў А. Н., Парфоменка Н. І., Нікаеў П. П., Новікаў А. А., Гамбург І. Л., (Буда-Кашалёўскі р.); Серакоў Я. Т., Бурыкін Ф. А. (Ветка ўскі р.); Дзмітраковаў П. І., Афанасенка Ф. В., Чамерыцкі П. Е. (Чачорскі р.); Петрусенка Ф. К. (Кармянскі р.).

3 ЛІСТАПАДА.

Ефіменка Я. К., Лук'яна Я. А., Кавалёў Ф. В., Гузенка М. Ф. (Брагінскі р.); Засадко А. Ф., Мяцельскі І. А., Бондарэц Р. Е., Жыўло І. Е., Ціхановіч А. К., Пікус Трафім Міх., Місюк П. А., Іваноў М. Е. (Рэчыцкі р.); Андросаў В. А., Раманенка С. І., Краўчанка В. Н., Любчанка В. Т., Хільковіч А. К. (Жлобінскі р.); Круглоў П. Г. (Глускі р.); Лапіцкі А. Б. (Парыцкі р.), Барысенак К. П., Бельчыкоў І. І., Майстроніч С. І., Марчоў А. С., Сталярчук І. Я., Каган М. І., Пчалкоў В. Ф., Шумейка І. М. (Мазырскі р.); Божыкаў Н. С., Влоцкі Г. Н. (Тураўскі р.); Душкін Я. Д. (Ельскі р.); Галубіцкі І. Л. (Жыткавіцкі р.); Шустэрман М. Л. (Петрыкоўскі р.); Дземешкевіч Я. А. (Нараўлянскі р.).

Яўка вышэйуказаных таварышоў або вязкова, прычым апошняя павінна прадставіць водгукі аб сваёй апошняй рабоце ад пізавых партыйных арганізацый.

Парткалегія КПК па Беларусі.

Сёння ў 7 гадзін вечара ў Доме партактыва (пакой 26) Менгарком КП(б)Б і рэдакцыя «Звязды» склікаюць

НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ШМАТТЫРАЖАК ГАРАДСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ЧЫГУНАЧН ГА ВУЗЛА

па пытаннях:

1. Аб падрыхтоўцы да ўсебеларускага з'езда рабселькораў.
2. Аб удзеле заводскага друку ў рэйдзе праверкі падрыхтоўкі транспарта да зімы.
3. Аб Окцябрскіх святах і перавыбарах советаў.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б
РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ».

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

МЕНСК

АДКРЫЦЦЁ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

23 кастрычніка ў Дзяржтэатры адбылося ўрачыстае адкрыццё гістарычнага факультэта ВДУ. Дэкан факультэта акад. **Шчарбакоў** зрабіў даклад на тэму «Крызіс буржуазнагістарычнай навукі і гістарычная асвета ў СССР і БССР».

З прывітаннямі выступілі акад. **Вальфсон**, ад Наркомасветы тав. **Ляшчынскі** і ад вышэйшага педагагічнага інстытута тав. **Мельцэр.**

Атрыманы прывітанні ад Інстытута гісторыі Усесаюзнай акадэміі навук і акадэміка **Лукіна**—ад групы гісторыкаў Масквы, прафесароў **Вэнага і Панкратавай.**

Сход паслаў прывітанні ЦК ВКП(б)—тав. Сталіну і ЦК КП(б)Б —тав. **Гікало.**

Здача учыня на ўцільпункце на Лагойскім шасе.

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МЕНСКА ДРОВАМІ

23 кастрычніка гартоп атрымаў 30 вагонаў дроў. 24 кастрычніка дровы не паступалі. 25 кастрычніка прыбыла 30 вагонаў дроў гартопу, 4 вагоны—для прамысловасці.

⊙ ⊙ ⊙

★ **ТРЭЦІ САНІТАРНЫ САМАЛЁТ** па ліку атрымаў ЦК Чырвонага крыжа БССР.

★ **КАЛЯ 4 ТЫС. ЧАЛАВЕК** наведала за чатыры дні выстаўку прадукцыі швейных фабрык БССР і УССР. На выстаўцы—867 экспанатаў.

★ **РАЁННАЯ НАРАДА РАБОТНІКАЎ ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОЎ І ЯСЕЛЬ** адкрылася ўчора пры горсавеце.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ПРОЛЕТАРЫЙ"

Ад 5 лістапада 1934 г.

„ТРЫ ПЕСНІ АБ ЛЕНІНЕ"

Вытворчасць Міжрабпомфільма

Рэжысер Д. ВЕРТАЎ.

„Ленін—горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і які адважна вядзе ўперад партыю па пазведаных шляхах рускага рэволюцыйнага руху".
(І. СТАЛІН).

„Стойце моцна, стойце дружна, смела ўперад супроць ворага, за намі будзе перамога. Улада памешчыкаў і капіталістаў, зломленая у нас, у Расіі, будзе пераможана ва ўсім свеце"—так гаварыў Ленін і яго словы зафіксаваны ў карціне.

ПЕСНЯ ПЕРШАЯ. У ЧОРНАЙ ТУРМЕ БЫЎ МОЙ ТВАР...

ПЕСНЯ ДРУГАЯ. МЫ ЛЮБІЛІ ЯГО...

ПЕСНЯ ТРЭЦЯЯ. У ВЯЛІКІМ КАМЕННЫМ ГОРАДЗЕ...

САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ!

САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ!

Памяшк. БДТ—1 тэл. 24905

Беларускі дзяржаўны тэатр Оперы і Балета

26 і 27 кастрычніка

ОПЕРА

ПІКАВАЯ ДАМА

у 4 дз., муз. Чайкоўскага.

Пастаноўка рэжысёра Маск. мастацк. тэатра ІВК СССР імя Максіма Горкага—Б. А. Мердзіванва, афармл. мастака П. Б. Вільямса.

Пачатак роўна в 8 гадзін веч.

Білеты ў касе тэатра з 12 да 2 гадзін і з 5 да 8 гадзін веч.

У рабочай касе—з 12 да 2 гадзін і з 4 да 6 гадзін веч.

Прымаюцца заяўкі ад ФЗМК на культ выходы і стаўлы месцы для ўдарнікаў.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".

Ад 25 кастрычніка 1934 г.

ЛЕПШЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ вытворчасці БЕЛДЗЯРЖКІНО

ПЕРШАЕ КАХАННЕ

Рэж. ШРЭЙБЕР. Сцен. Н. ТАЎБЭ

У галоўн. ролях: Б. Шліхцінг, А. Кострычкін, Л. Ладонина, Б. Брынцава.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ПАСЛЯ КОЖНАГА СЕАНСА выступае ВЯЛІКІ ЗАМЕЖНЫ АТТРАКЦЫЁН

Отто ФРАНКАРДЗІ

ШТОДЗЕННА 4 сеансы. Пачатак у 5.45, 7-30, 9-15, 11 гадз. Каса адкрыта ад 1 г. дня.

АДКРЫТ новы магазін канцылярскіх прылад

МЕНБАЗА БЕЛГАНДЛЯ

ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО

па Совецкай вул. (супроць ГУМа) у былым абутковым магазіне № 22.

АДКРЫТ МАГАЗІН КАНЦЫЛЯРСКІХ ПРЫЛАД

У продажы вялікі асартымент канцылярскіх прылад.

Магазін адкрыт з 10 раніцы да 7 вечара.

МЕНБАЗА БЕЛГАНДЛЯ.

УСЕ на ВЫСТАЎКУ!

з 21 па 31 кастрычніка

АДКРЫТА ВЫСТАЎКА

ПРАДУКЦЫІ ШВЭЙНЫХ ФАБРЫК БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ, якія ўключыліся ва ўсесаюзны конкурс на лепшую фабрычную марку

„ЧЫЯ МАРКА ВЫШЭЙ", „ХТО ЛЕПШ ШЫЕ".

Выстаўка адкрыта штодзенна з 11 г. раніцы да 10 гадз. веч., у б. клубе Менгорсовета (пляц Волі). УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Пры выстаўцы ёсць экскурсаводы. Арганізуйце калектыўнае наведванне.

ТАБЛІЦА

8-га тыража выйгрышнай пазыкі «ЧАПВЕРТАГА ЗАВЯРШАЮЧАГА ГОДА ПЯЦІГОДКІ» (бяспроцантны выпуск).

Тыраж адбыўся 11-12 кастрычніка ў г. Мерве (Туркменская ССР).

Выйгрышы па 100 рублёў палі на ўсе 50 аблігацый наступных серый:

№№ серый	№№ аблігацый	Сума выйгрышу	№№ серый	№№ аблігацый	Сума выйгрышу
00028	03153	07835	10200	13773	16837
00107	03301	07843	10235	13810	16931
00140	03768	07884	10445	13814	17222
00220	03857	07994	10528	13874	17458
00286	03886	08145	10743	14140	17493
00357	03804	08248	10751	14210	17558
00509	03954	08298	10795	14528	17632
00549	03998	08321	10824	14087	17655
00563	04027	08354	10840	14732	17771
00682	04122	08413	10894	15169	17821
00751	04288	08457	10953	15370	18011
00813	04404	08463	11208	15437	18193
00938	04506	08553	11234	15456	18227
01074	04632	08560	11274	15535	18299
01193	04825	08565	11501	15580	18338
01382	04842	08575	11696	15600	18562
01421	05007	08670	11719	15631	18398
01431	05302	08741	11795	15682	18415
01576	05334	08810	11859	15726	18014
01591	05494	08929	11923	15747	18919
01836	05597	09023	12244	15872	18943
01894	05744	09063	12355	15958	19225
02274	05751	09144	12416	15986	19227
02340	05836	09150	12652	15098	19428
02354	05873	09376	12805	16061	19470
02667	06276	09383	12959	16112	19627
02684	06326	09477	13045	16191	19858
02800	06500	09542	13051	16301	19869
02811	06621	09836	13055	16404	19902
02835	06811	09949	13085	16426	19903
02886	07173	10022	13176	16478	19897
02956	07247	10048	13603	16566	19920
03047	07771	10074	13697	16568	19941
03062	07775	10081	13692	16682	19999
03139	07812	10162			

Выйгрышы ў 200, 500, 1000 і 8000 рублёў палі на наступныя нумары серый і аблігацый:

00211	39*)	500	12002	1—50	200
00717	07*)	500	12236	22*)	8000
02277	22*)	1000	13170	32*)	500
03359	1—50	200	13327	37*)	500
04250	1—50	200	14283	41*)	500
04325	26*)	500	15350	08*)	1000
06109	32*)	1000	15709	1—50	200
06128	1—50	200	15951	1—50	200
06542	47*)	1000	16158	24*)	8000
06654	07*)	1000	16292	50*)	500
07297	25*)	1000	17075	19*)	500
08471	25*)	500	17148	31*)	1000
09221	26*)	1000	18075	1—50	200
09323	06*)	500	18085	12*)	1000
09658	1—50	200	18139	35*)	500
09822	1—50	200	18404	01*)	500
09995	1—50	200	18635	06*)	500
10088	04*)	1000	19103	23*)	500
11092	38*)	500	19421	07*)	500
11207	44*)	500	19568	1—50	200
11251	30*)	500	19615	07*)	500
11646	35*)	500			

*) Астатнія 49 аблігацый гэтай серыі выйгралі па 100 руб. кожная.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

СЁННЯ, 26-га кастрычніка ў 7 гадзін вечара, у Доме партактыва (рог вул. Энгельса і Карла Маркса) склікаецца

НАРАДА ПРОФАКТЫВА гор. МЕНСКА

ПАРАДАК ДНЯ:

Аб удзеле профактыва ў рабоце бюро скаргаў Камісіі Совета дзяга Кантроля (дакладчык—ч. в. а. упаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР—тав. КАМЕНЕЎ М. М.).

На нараду павінны з'явіцца: старшыні ФЗМК, старшыні рэвізійных камісій, цахпрофарганізатары, члены дэпутацкіх груп горсовета, рабочых кантралёры, грамадскія кантралёры, бюро скаргаў, рабкоры газеты „Рабочая", вынаходнікі-рацыяналізатары.

Рэгістрацыя пачнецца ў 6 з палов. гадз.

ЦЭНТРАЛЬНЫ СОВЕТ ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ.
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ „РАБОЧАЯ".
БЮРО СКАРГАЎ УПАЎНАВ. КСК па БССР.

Менская гарадская выбарчая камісія склікае усіх загадчыкаў клубамі і чырвоных куткоў па пытанню падрыхтоўкі клубаў да справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў.

Загадчыкі клубаў і чырвоных куткоў павінны з'явіцца ў горсовет, пакой 38, СЁННЯ, 26 кастрычніка ў 4 гадз.

ГОРСОВЕТ.

Народны Камісарыят Фінансаў БССР паведамляе, што на падставе загаду па Наркамцяжпрому СССР № 1286 ад 1-X—1934 г.,

Бел. раённае кіраўніцтва Саюзнафтгандля ў Бел. аддзяленне САЮЗНАФТАЗБЫТА

РЭАРГАНІЗАВАНА

Згодна Палажэння СНК СССР ад 9-II 1931 года аб дзяржаўнай РЭГІСТРАЦЫІ прадпрыемстваў, 21 кастрычніка—1934 года

Отворена рэгістрацыя бел. аддзялення Саюзнафтазбыта, якое знаходзіцца ў веданні Усесаюзнай канторы „САЮЗНЕФТЕЗБЫТА" на рэестру № 160.

Адрас: вул. Энгельса 23, к-н № 40-8333.

НАРКАМФІН БССР.

Полацкая аўтатрактарная школа механікаў і брыгадзіраў абвяшчае асенні набор

Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 20 да 35 год маючыя адукацыю за 5—6 класаў.

У школу механікаў прымаюцца асобы з вытворчым стажам трактарыста або шофера не менш трох год. У школу брыгадзіраў—не менш двух год.

Прыём заяў да 1 лістапада г. г. Да заявы прыкладваюць наступныя дакументы: анкета, даведка аб нараджэнні, аб адукацыі, аб сацыяльным паходжанні, аб вытворчым стажы і месцы працы, аб здароўі і карак на 40 кап.

Вучні забяспечваюцца стыпендыяй ад 60 да 80 руб., інтэрнатам і сталовай.

Адрас: г. Полацк, К. Маркса, 43.

Дырэкцыя.

Новы Мэблевы Магазін

МЭБЛЕВЫ МАГАЗІН

са Школьнай вул.

перамясціўся

ва ўноў адкрыты магазін

на Пляц Волі, дом № 4

(былы дом Горсовета)

У продажы вялікі асартымент тавараў: ложкі (нікеліраваныя, вялікія і малыя), шкафы новых фасонаў, крэслы, сталы і т. д.

Магазін адкрыт з 10 раніцы да 10 вечара.

МЕНБАЗА БЕЛГАНДЛЯ

ЦЫРКАВОЕ ЭСТРАД ДЕ БЮРО

Наркомасветы БССР даводзіць да ведама ўсіх культадзелаў саюзаў, загадчыкаў клубамі, фабзаўкомаў і інш. заінтэрэсаваных арганізацый, што з 15 кастрычніка

ЦЭБ'ам прымаюцца заяўкі на мастацкае абслугоўванне артыстычнымі сіламі Окцябрскіх свят.

Для мастацкага абслугоўвання окцябрскіх свят спецыяльна запрашаюцца артысты вышэйшай кваліфікацыі як БССР, так і іншых рэспублік наступных жанраў: юмар, сатыра, скетчы, ансамблі, цырк, балет, інструменталісты і інш.

Прыём заяваў штодзенна з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня ў памяшканні ЦЭБ, клуб Соўгандальслужачых (рог Энгельса і Комуністычнай, пакой № 8, тэл. 22-755).

ЦЭБ.

Друкарні „ЗВЯЗДА" патрэбны ВАРТАЎНІКІ для аховы друкарні, грыбёшчыкі на ратацыйнай машыне і вучні-ліпатыпісты.

Звяртацца, Совецкая, 63, II-гі паверх, да дырэктара, з 12 да 1 гада. дня.

Рэдакцыі „ЗВЯЗДЫ" ПАТРЭБЕН МАСТАК-РЭТУШОР.

Звяртацца ў мастацкі аддзел рэдакцыі.

Адзінокаму ПАТРЭБЕН невялікі ПАКОЙ.

Пажадана ў центры. Аплата па згодзе. Аб умовах звяніць па тэлефону 21-340

Барысаўскі рускі педагагічны тэхнікум абвяшчае асенні НАБОР студэнтаў на 1 курс заочнага сектара на 1934-35 навучальны год.

ЗАОЧНЫ СЕКТАР РЫХТУЕ НАСТАЎНІКАЎ ДЛЯ РУСКІХ ШКОЛ.

Прымаюцца асобы, маючыя асвету не ніжэй сямігодкі, ужываючыя рускай мовай і працуючыя ў школах, не маючыя спрэдняй асветы.

Патрэбна прадставіць заяву з дакументамі: анкета, даведка аб соцстановішчы, метрыка і пасведчанне аб асвеце.

Тэрмін падачы заяў да 20 кастрычніка.

Асобы, паступаючыя на заочны сектар, трымаюць іспыты па рускай мове, матэматыцы, гісторыі і грамадазнаўству.

Тэрмін навучання—3 гады. Заявы на кіроўваць па адрасу: г. Барысаў, Подбельскага, № 39, рускаму педтэхнікуму.

Нам. дырэктара тэхнікума ГАНЧАРОЎ.

Гукавы кіно-тэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ"

Сёння, 26 кастрычніка

мастацкі фільм

ДЖАЛЬМА

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:

КАНЦЭРТ

Усходня-этнаграфічнага ансамбля

ВЫДАТНЫХ ТАНЦОРАЎ І ТАНЦОВАЧАК

Зусім новая праграма.

МУЗЫКА, ТАНЦЫ.

Пачатак 1 сеанса ў 6 гадзін вечара.

Каса адкрыта з 1 гадзіны дня.

Кіно „Інтэрнацыянал" НОВАЯ ПРАГРАМА

Кіно „СПАРТАК" Па раману Лермантава драма ў 7 частках Максім Максімавіч (Прадпраг карціны „ВЭЛЯ")

Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метраклаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — ПЕДЗІКАЎ, ст. друкар — АНУЧЫН.

Менск, друкарня «Звязды». Уп. Галоўлітбела № К—3278.